У манастыр ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

АЛЯКСАНДР МУСЬКО ☞ I

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 16 (2605) Год LI Беласток, 16 красавіка 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

В. Луба: Не было ніякіх патрабаванняў вяртаць датацыі. Я разумею, што калі міністэрства адабрала нашы заявы і разлікі, не было няправільнасцей...

Здаровым розумам

— Я лічу, што абвінавачанні нас крыўдзяць. Вымантачванне датацыі і фальшаванне дакументаў гэта звышінтэрпрэтацыя, — даваў свае паказанні ў час апошняга судовага разбору ў справе Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" былы яе галоўны рэдактар, а цяпер намеснік, сведка Віталь Луба.

Як мы ўжо шмат разоў пісалі, абвінавачанні пракуратуры Беласток-Поўдзень зводзяцца перш за ўсё да быццам бы парушэнняў закону аб рахункаводстве галоўнай бухгалтаркай Марыяй П. і былым старшынёй Праграмнай рады Яўгенам М. пры разліку мэтавых датацый ад 2001 да першага квартала 2003 г. Пракуратура накіравала справу ў Крымінальны аддзел беластоцкага Раённага суда. Агулам перад судом стаіць 11 асоб звязаных з Радай. Нягледзячы на прапанову пракуратуры не прыцягваць да адказнасці і адтэрмінаваць на год умоўнае пакаранне (па-за Марыяй П. і Яўгенам М.) апошніх асоб, яны не пагадзіліся і хочуць ачысціцца ад абвінавачанняў перад судом. Пасля выступленняў абвінавачаных у час першага разгляду і часткі сведкаў у час другога, на апошнім пад агнём пытанняў сталі сведкі Віталь Луба і экспертка па бухгалтэрыі Анна Андрэйчук, якая раней дала кансультацыю пракурору.

Віталь Луба тлумачыў бессэнсоўнасць абвінавачанняў у быццам бы перавышанні тыражу „Нівы" ў час старанняў за датацыі.

— Асноўныя кошты нашага тыднёвіка гэта аб'ём і перыядычнасць выдання. Сам працэс выдавання і яго кошт — такі самы як для тысячы, паўтары ці дзвюх тысяч экземпляраў.

Былы галоўны рэдактар падкрэсліў, што Марыя П. увесь час вяла дакументацыю добра, бо донар, Міністэрства культуры і мастацтва, як і іншыя ўстановы пры разліках не прад'яўлялі заўваг.

— Мы кіраваліся галоўнай мэтай: рэгулярным выдаваннем часопіса.

Спасылаючыся на кантроль Найвышэйшай кантрольнай палаты, сцвердзіў:

— Кантралёр НКП (у працэсе сведка Роберт Скварко — Р.С.) заявіў мне коратка і востра: не трэба было падпісваць такіх дамоў. Мы ў такі спосаб не маглі гаварыць з міністэрствам. Яно адабрала нашы разлікі.

Дадаў таксама:

— Праграмная рада не займалася фінансавымі справамі *sensu stricto*, хоць аб выдавецкіх планах мы ў Радзе размаўлялі ўсе. У сённяшняй сітуацыі няма нават шанцу, каб можна было кагосьці абвінаваціць у нейкім вымантачванні. Пасля папярэдняй заявы, перад падпісаннем дамовы, падаецца другая — пад рэальныя датацыі абяцаныя міністэрствам. Тады так не было. Мы кіраваліся здаровым розумам.

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Анна Андрэйчук (дае паказанні): Я дастасоўвалася да ўказанняў пракурора...

Яўген М. аднёсся да аднаго з пытанняў-унушэнняў суда, звязаных з публікацыямі ў справе „Нівы" ў „Кур'еры паранным":

— НКП дала доказы да інспіраваных сабой інфармацый. Я не пазнаў сваіх выказванняў. У „Кур'еры" паявілася адно чвэрць майго абвяржэння і не быў гэта пераказ майго выказвання.

У экспертцы па бухгалтэрыі пыталіся:

— Ці памылкі галоўнай бухгалтаркі выніклі з няведання прынцыпаў рахункаводства і звычайнага разгільдзяйства?

Анна Андрэйчук:

— Цяжка тут гаварыць аб мэтанакіраванасці. Гэта больш за ўсё недахоп ведаў і вопыту. Закон аб рахункаводстве дапускае дзве магчымасці ў акрэсліванні прынцыпаў рахункаводства, але не ў цалкам адвольны спосаб, асабліва калі браць пад увагу публічныя сродкі і дэталёвы разлік кожнай датацыі.

І спаслалася на свае сцвярджэнні, дадзеныя ў акты:

— Рахункаводчыя кнігі вяліся ў вельмі спрошчаны спосаб, што вынікала з недахопу вопыту і нагляду донараў: Міністэрства культуры і мастацтва, Гарадской управы, Маршалкоўскай управы. Калі быў бы правільны нагляд, такой сітуацыі не было б.

Пасля серыі дэталёвых пытанняў экспертка сканстатавала:

— Ацэнкі — не маё заданне. Я дастасоўвалася да ўказанняў пракурора. У сваёй кансультацыі я давала толькі адказы на яго запыты. Рэшта не была маёй мэтай.

Яўген М. пасля выслухання „дыскусіі" паміж абвінавачанымі, судом і абаронцамі паставіў пытанне, здавалася б, рытарычнае:

— Колькі бухгалтараў і юрыстаў павінна быць у фірме, у якой займаецца восем асоб?

З пытанняў абаронцаў можна было зрабіць вывады, што крымінальны аддзел — месца не ўласцівае для разгляду рахункаводчай справы „Нівы". Як нам пасля разгляду сказаў юрыст Мацей Грышкевіч, у рахункаводчых справах мусіць сцвярджацца мэтанакіраванасць дзеяння, а тут цяжка гаварыць аб такім, дарэчы, беручы пад увагу паказанні кансультанткі і іншых сведкаў. У сваю чаргу, закон аб рахункаводстве, пры парушэннях якога вядзецца разгляд па волі пракуратуры, якраз гаворыць аб крымінальнай адказнасці.

Наступны разбор адбудзецца 9 мая. Свае паказанні мае даваць Івона Гродзкая, раней супрацоўніца МКіМ, а цяпер Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якое ўжо больш за год курыруе арганізацыі нацыянальных меншасцей.

Раіна Стэфанчук

Нашым чытачам-каталікам жадаем радасці ад духоўнага абнаўлення, прыемнага адпачынку ў сямейным крузе ды смачных страваў на Велікодным стале.

Рэдакцыя

Магічнае „тры" ☞ 2

Віктар Сазонаў

Калі верыць сцвярджэнням лічбавых прыкметаў, асабліва магічнай лічбы „тры", то тыя часы не засталіся аж так далёка ў мінулым як можа падавацца. Вось ужо трэці раз запар першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даў прысягу на вернасць беларускаму народу...

Дні культуры ☞ 5

Міра Лукша

З Беларусі прыехалі на дні культуры гурт „Неўра Дзюбель" (пратрымалі яго на мяжы ў Кузніцы; за той час, калі чакаўся ён у „Фаме", дала чаду гарадоцкая „PIMA" ў першы, рокавы вечар). Гучны рок і ў выкананні Ілоны Карпюк разам з „5set5" прыцягнуў не толькі маладых беларусаў і палякаў...

Ян Сянкевіч ☞ 8

Змяняюцца ўлады і лады, прападаюць і паяўляюцца дзяржавы, а чалавек з-пад Вільні знойдзе супольную мову з кімсьці з-пад Гродна, Беластока ці Маладзечна хутчэй, чым з-пад Коўні ці Панявежа. Думаю, што і той з-пад Беластока лепш дагаворыцца з тым з-пад Ашмяны ці Навагрудка, чым, скажам, з Познані ці Кракава...

Правы чалавека ☞ 9

Раіна Стэфанчук

У Белавежы і Гайнаўцы тры дні на пераломе сакавіка і красавіка праводзіўся Аб'язны фільмавы фестываль Хельсінскага фонду правоў чалавека, сарганізаваны пад лозунгам „Правы чалавека ў фільме". На паказ дакументальных фільмаў, якія датычылі гэтай праблематыкі ў Беларусі, дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры Ян Карпюк якраз у гэтым месцы не даў згоды...

Чаромха ў вайну ☞ III

Аляксей Мароз

Ваенныя дзеянні летам 1944 года, якія закончыліся вызваленнем Чаромхі-Вёскі з-пад нямецкай акупацыі, доўжыліся каля двух тыдняў. Сяло было амаль цалкавіта знішчанае ад артылерыйскіх абстрэлаў і пажараў. Перад адступленнем нямецкія салдаты падпальвалі хаты, якія ўцалелі ад абстрэлу. На 140 дамоў у Чаромсе нязнішчанымі асталося толькі каля дзесяці хатаў...

Магічная лічба „тры”

Лічба „тры” кожнаму славяніну заўсёды была нейкай магічнай, нешта азначаючай і незразумела таямнічай. Пры гэтым яна магла несці як добры, так і кепскі сэнс. А часамі нешта сярэдне-незразумелае ці зразумелае да паловы, або ад паловы незразумелае. Памятаю з дзяцінства, як на Вялікдзень у гасцях, непітушчую жанчыну (а тады такія яшчэ былі), гаспадары абавязкова змушалі выпіць трэці кілішак, прыгаворваючы ў якасці аргумента словы, што Бог Тройцу любіць. А вось на паховінах за супакой душы нябожчыка выпіць больш трох чарак лічылася дурным тонам. Каб прагнаць нячысціка ці прывід які трэба было тройчы перажагнацца, а каб нішто не замінала здзяйсненню задуманага — тры разы плюнуць праз левае плячо (у некаторых месцах неабавязкова праз плячо, галоўнае тройчы).

З тае магічнасці і таямнічасці лічба тры ўвайшла ва ўсе сферы чалавечага жыцця. Памылкі супрацоўніка церпяць да трэцяй. Калі на штосьці хочуць звярнуць асаблівую ўвагу, то паўтараюць тройчы. Нават спартоўцы, каб паставіць рэкорд, або з тае звышфізічнае напругі канчаткова надарваць здароўе і пасля ўсё жыццё па тэлевізары назіраць як іхныя рэкорды б’юць іншыя, маюць тры спробы. Дыктатарскія рэжымы любяць забараняць грамадзянам збірацца больш трох. У разведку не рэкамендуецца адпраўляць менш трох чалавек. Алкаголікі імкнуцца распіць бутэлечку акурат на трох. А ў каханні менавіта трэці лічыцца лішнім.

Праўда, нармальны чалавек, у нармальнай дзяржаве, маючы звычайнае жыццё, не асабліва звяртае ўвагу на міфічнасць лічбаў, на іх значэнне (акрамя рэжысёраў фільмаў-жахаў, якія толькі містыкай могуць прывабіць гледачоў), і ніяк не звязвае гэтага з мажлівымі прадказаннямі лёсу яго краіны, яго народу і свайго асабістага. А вось жыхары тых краін, дзе можна за кожнае слова, сказанае ў кампаніі больш трох чалавек, дастаць больш трох разоў па галаве і дзе, калі не ведаеш Эзопавай мовы, лепш зусім не разяўляць рот (як выключэнне, рот разяўляць можна толькі на прыёме ў дантыста і то прытым трэба старацца не гаварыць), напоўніцу выкарыстоўваюць значэнне таямнічасці міфічных лічбаў. Прыкладам, у часы Савецкага Саюза сімвалізм лічбы тры дапамагаў людзям даведацца, ці яны пад кантролем КГБ (поўную назву „Коммитет государственной безопасности”, ці абрэвіятуру „КГБ”, заўсёды трэба пісаць на мове арыгінала). У тыя часы гаварылі, што калі штосьці нядобрае зрабілася адзін раз, то гэта выпадковасць. Калі тая ж сама благая з’ява паўтарылася, то гэта супадзенне. Ну, а калі ўсё ж так сама кепска здарылася трэці раз, то гэта афёры КГБ. І ніякіх у тым няма сумненняў.

Калі верыць сцвярджэнням лічбавых прыкметаў, асабліва магічнай лічбы „тры”, то тыя часы не засталіся аж так далёка ў мінулым як можа падавацца. Вось ужо трэці раз запар першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даў прысягу на вернасць беларускаму народу. А самы вядомы на свеце супрацоўнік КГБ (кажуць што былы супрацоўнік, хоць усім вядома, што былых супрацоўнікаў КГБ не бывае) Владимир Владимирович Путин ужо двойчы павіншаваў яго з перамогай. У Владимира Владимировича такая звычка віншаваць двойчы. Прэзідэнта Украіны ён таксама віншаваў з перамогай два разы. Спачатку Януковіча, які выйграў па версіі кучмаўскага ЦВК, пасля Юшчанку, які перамог па версіі Майдана. У Беларусі і па агучанай версіі Лідзіі Ярмошынай, і па версіі ЦВК перамог адзін чалавек. Але Путин усё ж павіншаваў яго двойчы. Цяжка сказаць чаму. Ці таму, каб не перапыняць традыцыі, ці можа таму, што вельмі бракавала тых віншаванняў ад кіраўнікоў іншаземных краін. Але як бы не было, сцвярджэнне, што калі тое самае здараецца трэці раз, то гэта афёра КГБ, як бы спраўджваецца.

Але не ўсё так кепска. Кожная з’ява мае і адваротны бок медаля. Нарэшце ўвесь свет пабачыў жаданне Путина трэці раз стаць прэзідэнтам. На гэты раз прыдуманай ім жа міфічнай „российско-белорусской” дзяржавы. А беларусы зразумелі, што такой дзяржавы яшчэ няма і не будзе. І зразумелі, калі беларускі прэзідэнт, што так любіў з’яўляцца на экранах тэлевізараў, адразу пасля выбараў надоўга недзе знік, а жыццё ішло сваім парадкам, значыць, Беларусь можа існаваць і без прэзідэнта.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Свята вясны і іншыя

Тым часам наступілі цёплыя ночы і дні, снягі асабліва працяглай і ўтомнай зімы расталі, сплылі і прапалі ў адхланні, ахапіла мяне радасць быцця і быту, а аднойчы на шпацыры вуліцамі горада я адчуў, што паветра прасякнута святасцю. Вясна, кажуць, спрыяе пагляду на рэчаіснасць як на цэласць вечную, незнішчальную, што адраджаецца кожны раз пасля мёртвага сну; быццам кола, колазварот, быццам бы кружэнне рэчаў бачных і нябачных, але перш за ўсё адраджэнне жывога жыцця. Вясна схільвае нас да надзеі.

Аднак напатканы ў цэнтры горада малады паэт-постмадэрніст выглядаў неяк няважна. Горбіўся пад скурай курткі, а, можа, не надта ўпэўнена азіраўся на бакі. Я не вельмі зважаў на тое, што ён гаварыў, а выказаў быў ён стары, здзерты тэкст аб прыемнасцях даўно прамінулай камуны, а перш за ўсё аб раскошах быцця літаратарам у рэальным сацыялізме. Пяяў, як то тады кожны без вынятку пісака меў пачуццё прыналежнасці да эліты, да катэгорыі абраннікаў, а ўсё тое прысвойвала адзіная і непаўторная партыя. Сёння якраз няма адпаведнага дэкрэту, хоць, хто яго ведае; агрэсіўныя, гатовыя на ўсё і перакананыя ва ўласнай беспамылковасці палітыкі стукаюць у нашы вокны і дзверы. Прытым як жа ж падобна гучаць выказванні прадстаўнікоў крайняй лявіцы і крайняй правіцы, мабыць, па прынцыпе ліквідуючыхся супярэчнасцей. А гэтыя галасы накіраваны супраць старой, ліберальнай Еўропы, супраць прынцыпаў дэмакратычнай дзяржавы, супраць свабоды і індывідуальнай адказнасці асобы.

Калі выслухоўваю такія погляды, не магу не адчуць уражання, што маёй віной з’яўляецца тое, што задоўга жыву, што зашмат памятаю. Я належу да пакалення, якое памятае славуты сказ Сталіна аб пісьменніку як інжынеры чалавечых душ. Татальная дзяржава карысталася пісьменнікамі для ўсхвальвання актуальнай палітыкі, для часовай прапаганды. Не было ў цане свабоднае, незалежнае слова, супраць яго накіраваны былі ўз’яднаныя сілы цэнзуры і палітычнай паліцыі. Мабыць, залішняя ўвага да пісанага слова абярнулася ў выніку супраць пісьменнікаў, у эпоху сталінізму зніштожылі цвет беларускіх літаратараў, а нават цвет беларускай інтэлігенцыі, абаронцаў і сейбітаў нацыянальнай культуры. Чаму забываецца аб паражаючых розумы тады тэроры і страху?

Пісьменнікі не мусілі азірацца на чытачоў, — махаў рукамі малады паэт, — чытачоў надзеленых благім густам, пісьменнікі не мусілі ім ліслівіць, старацца за поспех. А сёння шалее свабодны рынак, маюць у ім поспех аўтары папулярныя, якіх кнігі гарантуюць прыбытак прыватным выдаўцам. А я ўзіраюся на ўсхваляванне маладога паэта, які мінулую эпоху ледзь памятае, бо што ж важнейшае ад подыху маладой вясны. Ды здзіўляе мяне тая прага спынення перамены і руху, імклівасці нашага свету, тая выказаная ім настальгія па часе, калі пісьменнікі спазіралі на рэчаіснасць з верхавіны высачэзнай вежы, уздымаючайся над гнілым подсцілам сталай сушы. І ўздыхаю, якія ж невыносныя тыя мастакі, што хочуць быць у цэнтры ўвагі вяльможаў гэтага свету. Пісьменнікі — мандарыны, якія рэалізуюцца ў быцці важнецкай асобай і індывідуальнасцю, хцівыя ўзнагарод і адабрэння. Якую цану гатовы яны заплаціць, каб падпісаць кабальнае абавязацельства за сваю душу?

Прыйшоў мне раптам на думку партугальскі паэт Фернанда Песоа, які пісаў у самоце, змагаючыся з дэпрэсіямі, мабыць, што парадаксальна, чэрпаючы з дэпрэсій энергію для творчасці. Прыналежыў ён да мастакоў ночы, кажаноў, начных птахаў, сягаючых, аднак, да глыбокіх, з самага дна рэчаў бачных і нябачных. „Усё, што я напісаў — цёмнае. Магло б здавацца, што маё інтэлектуальнае жыццё — бы той нудны дажджлівы дзень, калі ўсё здаецца быць нічымнасцю і паўценнем, пустой прывілеяй і забытым розумам” — заўважыў Песоа. Бо што ж гэта такое — тое ўздыманае пад самыя нябёсы мастацтва? Яно ж штучнае, яно — канструкцыя з элементаў бруду, выпадковасці, аскепкаў нашага жыцця. Натхнёны, экзальтаваны — найчасцей графаман, а экзальтаванасць з’яўляецца сантыменталізмам, мінаючым, кароткачасовым, марным.

Дык нашто пісаць? Якая мэта пісання? Падазрона варухнуў вушамі малады паэт. Пісаць трэба для таго, каб узнік тэкст, добры тэкст, паўтарыў я думку Вітальда Гамбровіча. Так мала гэта, і так шмат. О, вясна святая!

Ежы Плютовіч

Вачыма еўрапейца

Працяг санкцый

Еўрапарламент у апошнія дні прыняў чарговую, яшчэ больш рашучую рэзалюцыю па справах Беларусі. У гэты раз датычыць яна сітуацыі пасля прэзідэнцкіх выбараў. Беларусь крытыкуецца за іх правядзенне ў атмасферы страху, праследу і арыштаў вядучых кіраўнікоў апазіцыі. У час пасяджэння ЕП госцем еўрадэпутатаў быў кандыдат апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах Аляксандр Мілінкевіч.

— На спісках з забаронай уезду павінны апынуцца сотні асоб [пакуль што, іх за 30 — М. Х.]. Для шмат каго з іх гэта будзе вельмі балючае рашэнне, — пераконваў.

Падтакваў яму старшыня ЕП Жузэп Барэль:

— Еўропа не будзе поўнасцю дэмакратычная, калі Беларусь не будзе поўнасцю свабоднай.

Еўрадэпутаты адназначна асудзілі выбары. Аляксандр Лукашэнка не можа быць прызнаны законным прэзідэнтам Беларусі, а выбары павінны быць паўтораны згодна з міжнароднымі стандартамі. Савет і Камісія былі закліканы да ўключэння ў спісак ахопленых візавай адмовай асоб не толькі з шэрагу самых высокіх рангам прадстаўнікоў рэжыму, але і прадстаўнікоў мясцовых улад, рэгіянальных і акадэмічных, замешаных у парушэнні правоў чалавека і палітычнай свабоды. Падтрымана была ідэя замарожання замежных банкавых рахункаў прадстаўнікоў беларускіх улад, усчацце рэстрыкцыйных мер у адносінах да фірмаў звязаных з высокага рангу прадстаўнікамі рэжыму і замарожанне прыватных сродкаў самога Аляксандра Лукашэнкі і яго дарадчыкаў. Самае важнае, калі гаварыць аб магчымай паспяховай ізаляцыі Беларусі кіраванай Аляксандрам Лукашэнкам, парламент сцвердзіў, што ён „ашарашаны адабральным рашэннем расійскай Дзярждумы і прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна ў сувязі са спосабам правядзення прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі і іх вынікамі”. Патрабуе таксама, каб членскія краіны з Групы Г-8 (самыя багатыя) забавязалі прэзідэнта Пуціна змяніць адносіны да беларускага рэжыму.

Аляксандр Мілінкевіч пераконваў:

— Аляксандр Лукашэнка не прэзідэнт, а грамадзянін Лукашэнка.

У час дэбаты старшыня калектыву па справах Беларусі Багдан Кліх запэўніваў:

— Кончыўся час дыягназаў, пачаўся час выпісвання рэцэптаў.

І дадаў:

— У распараджэнні Расіі знаходзяцца такія прылады палітычнага і эканамічнага націску, якія могуць спрычыніцца да палагоджання рэжыму ў Мінску, а Еўрапарламент мае ў распараджэнні такія прылады ўздзеяння на Расію, якія могуць памагчы ёй пажадаць хацець.

Істотнай была таксама спроба пераканання Заходняй Еўропы да пераламання пэўнага стэрэатапу думання пра Беларусь, якую выказаў дэпутат Януш Анышкевіч:

— Еўрасаюз становіцца ўсё важнейшым фактарам у беларускай гаспадарцы і адтуль мусіць выплываць наша перакананне аб тым, што можам сапраўды мець магчымасці ўплыву на тое, што дзеецца ў Беларусі.

Еўрадэпутатка Барбара Кудрыцкая:

— Мы павінны ў Еўропе ламаць, існуючы, на жаль, стэрэатып, што беларусы абруселыя настолькі, што не жадаюць уласнай ідэнтыфікацыі абапертай на асобную культуру, мову і нацыянальныя сімвалы.

Паслявыбарчая рэзалюцыя ЕП выклікала маланкавую рэакцыю МЗС у Мінску. Было заяўлена, што яна не будзе сур’ёзна разглядацца, бо, як сказаў прэс-інфарматар знешнепалітычнага ведамства Андрэй Папоў, не хапае ў ёй канструктыўных элементаў:

— Еўрадэпутаты не заўважылі або не хацелі заўважыць, што гэта выбар беларускага народа і ён ніякага прызнання ці непрызнання звонку не патрабуе.

Мацей Халадоўскі

На аўтафуры ў манастыр

— Прамантачаць край, няйначай, — Вольф апавядае нам пра таемныя фабрыкі Аляксандра Кваснеўскага. Паводле яго, Кваснеўскі — першы бос у галіне сухапутнага транспарту. Яму належаць усе транспартныя фірмы Сілезіі...

Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

Усе дарогі, як у часы Рымскай імперыі, сёння вядуць у Рым. Карацей, тысячы паломнікаў з Польшчы направіліся ў бок вечнага горада, каб памаліцца ля магілы папы Яна Паўла II. Заўтра 2 красавіка — першая гадавіна смерці папы-паляка.

Цяжкавата адхіліцца ад хвалі рэлігійнай эйфарыі, якая льецца ад рання ў СМІ. Атмасферы падвяргаецца і наш шафёр Анатоль з Беластока.

— А ці не ў Рым часам спяшаем? — пытае асцярожна.

— Не-не, у іншы бок.

Анатоль рады адказу, яшчэ больш уцешыцца, калі пачуе пра нашу пілігрымку ў Пачаеўскі манастыр:

— Вазьміце і мяне з сабой, сёстры, — заяўляе з нечаканай нотай захаплення, — я ж праваслаўны брат ваш!

Анатоль, хоць не манах, прыкладны брат-хрысціянін. Хаця яму не па дарозе, вязе нас у сам канец Бельска, бо там лягчэй злавіць чарговы аўтастоп. У дарозе ўспамінае сваю гуманітарную паездку ў Жыровічы.

— Ну і бяда ў іх! — падводзіць усю справу.

* * *

Бяда сустракае нас ужо ў Боцьках, дзе доўга ніхто не хоча падабраць нас з дарогі. За каўнер лупіць халодны дождж і нервова шуміць рака Нурэц. Рэчанька спакойная і непрыкметная летам, наводзіць жах на прадвесні. Зараз таксама падтапіла некалькі сяліб.

— Takie śliczne i nikt nie bierze? — чуваць голас за спіной. Гэта гаспадар хаты, каля якой чыпім з Д. як затычкі ад пекла. Дзядзька азіраецца на сваю хату, а пасля ў падскоках бяжыць у краму за паваротам.

У Боцьках усе дарогі вядуць у магазін.

— A czy widzieli, gdzie on poszedł? — спытае праз момант жонка гаспадара, які перад хвілінай смяяўся з нашай няўдачы. І, не чакаўшы адказу, таксама гоніцца на ровары ў напрамку крамы. Пасля назіраем сцэну. Наш гаспадар ідзе першы, як злачынец. За ім крочыць з роварам жонка:

— Tyle roboty w chacie, a on tylko żeby ryło zalać...

— А ты што сёння зрабіла? — агрызаецца муж.

Няма дзе схавацца ад іх разборкі, якая з кожным крокам набірае салёнай інтэнсіўнасці. Азірнешся ўзад — там пеніцца мутная рака. Зірнеш у неба — чорныя хмары плывуць. Глянеш убок — чарговы аматар сляпіцай прэцца ў краму. Словам, тупік няшчасны.

У канцы падбярэ нас з дарогі студэнт Ромак, які з піскам колаў вывезе нас з падтопленых Боцькаў.

* * *

Ромак ужо з першага погляду здаўся падазроным. Усё яму падабаецца, усё яго цешыць. Яго ўсмешка таксама занадта радасная на наш дэпрэсіўны куточак.

— Я — армянін *естэм*, — заяўляе пасля першых хвілін знаёмства, — са сталічнага Ерэваня *естэм*.

Хочам расказаць пра свае меншасці, але Ромак нянадта разбіраецца ў нацменаўскіх адценнях. Пытае, калі прыехалі ў Польшчу. І ці маем дазвол на працу? Бо ён ужо ад дзесяці гадоў у Мендзыжэчы-Падляшскім. Бацькі ўцяклі ад вайны. А яшчэ больш у пошуках лепшай для Рамана і яго сястры долі. Раман ідэальна вывучыў польскую мову, у яго гаворцы толькі адно слова „Сэмятычы" наклікае сумненні.

— Зараз я студэнт інфарматыкі ў Любліне, — заяўляе з той жа чароўнай усмешкай. Каб падзарабіць на навуку працуе ў фірме „Багетка". Дзень у дзень прачынаецца ў тры гадзіны раніцы. Пасля гоніцца з Мендзыжэча ў Гайнаўку, а далей у Бельск. Мусіць паспець на шэсць гадзін раніцы з хлебам і пончыкамі ў магазіны „Бядронкі" — сто пяцьдзесят кіламетраў у адзін бок! Свой маршрут Раман паўторыць яшчэ раз, пасля абеду.

— А дзе тут эканоміка?

— Я пра яе не думаю, — адказвае прадстаўнік самай эканамічнай у свеце нацыі і зручна мяняе тэму. — У дарозе, — кажа Ромак, — думаю пра сяброў і сваякоў з Арменіі.

Расказвае нам як па ночах размаўляе з імі па Інтэрнэце, піша мэйлы, дапамагае радай і вопытам. Пасля яшчэ вучыцца да экзаменаў, думае пра будучыню і планы на чарговы дзень.

Аж страшна спытаць пра час, які наш жыццярадасны шафёр прызначае на сон.

* * *

Затое Вольф, польскі немец з Сілезіі, сфрустраваны як статыстычны славянін.

— Да чаго яны давядуць гэты край? — хвалюецца наш чарговы шафёр. Найбольш нервуюць яго касмічныя фартуны палітыкаў.

— Прамантачаць край, няйначай, — Вольф апавядае нам пра таемныя фабрыкі Аляксандра Кваснеўскага. Паводле яго, Кваснеўскі — першы бос у галіне сухапутнага транспарту. Яму належаць усе транспартныя фірмы Сілезіі.

— У нашу фірму таксама ён прыязджаў, — сам Вольф не бачыў, але сябры апавядалі. — Высеў з „мерседаса" ў чорных акулярах, з чорным чамаданчыкам. Людзі дадумаліся хто ў іх шэф! Праўда, фірма зарэгістраваная на іншую галаву. Ды хто паверыць у такія казкі?

Напэўна не Вольф — ён чалавек бывалы, па ўсёй Еўропе ездзіць. Вольф — шафёр аўтафуры з дзесяцігадовым стажам. Зараз вяртаецца пасля дванаццацідзённага рэйса з Масквы.

— Папраўдзе не з Масквы, а з Амстэрдама, — паясняе. Бо там загружваюць яму тавар, які пасля вязе ў Маскву.

— А што дабрага возіце?

— Нічога, — чуецца абыякавы адказ, — галандскія сыры.

— Самай кашмарнай перашкодай на шляху зараз з'яўляецца Беларусь. Там могуць перахапіць тавар, — наракае шафёр. І яго шэф, значыць, чалавек Кваснеўскага, направіць яго кругаля, праз Літву, Латвію, паўночную Расію. Гэта, паводле Вольфа, таксама кашмар. Бо яшчэ больш доўжыцца разлука з жонкай, дзяцьмі. Сям'я — найважнейшая, — кажа тонам практыка, — толькі ў дарозе я дацаніў хатні абед, сваю пасцель, забавы з дзяцьмі.

Сам Вольф не баіцца Беларусі. Ён пад уражаннем беларускіх дарог, яны лепшыя яму ў сто разоў за польскія.

— І навошта палякі соваюць нос у беларускія справы? — шафёр мае на ўвазе падтрымку джынсавай рэвалюцыі. — Навошта выпендрывацца? Не лепш навесці парадак у сваёй краіне?!

Праз момант пачынае хваліць Лукашэнку. Нам, аднак, не шанцуе выслухаць ягоны даклад. У машыне лопае лабавая шына.

Вымушаны прыпынак ля ракі Вепш чамусьці адлюстроўвае чорныя прароцтвы Вольфа. Аварыя машыны здзяйсняецца на дарозе, пашкоджанай веснавой паводкай. Абапал „плаваюць" залітыя лугі, сады і загоны. З вокнаў падтопленых дамоў прабіваецца чэрнь. Ды яшчэ, як на злосць, усюды плаваюць лебедзі і качкі — сучасны сімвал віртуальнай пошасці.

— Шукайце іншага транспарту, — раіць. З цяжкім сэрцам пакідаем Вольфа сярод мутной вады. Няма часу азірацца, нам неабходна яшчэ сёння дабрацца на мяжу. Драматычны пейзаж дапамагае нам.

* * *

Неўзабаве мы пераходзім у цёплую аўтафуру Лешка.

— Калі ласка, схавайся за занавескі, — прапануе спачатку маёй сяброўцы. Д. паслухмяна скідае боты і залазіць на заднюю лаву, якая напамінае ляжанку. Зацягваем занавескі. Раней, па радыё Сі-бі папярэджваюць пра мянтоў. Калі шчасліва мінем ахоўнікаў правапарадку, Д. пакідае схованку. У аўтафуры Лешка можна везці толькі адну пасажырку.

— Да Любліна дарога чыстая, — інфармуюць спераду па Сі-бі. Між камунікатамі Лешак не можа надзівіцца, што дабравольна прэмся на Украіну. Ён сам нядаўна вярнуўся з Днепрапятроўска. На адны хабары міліцыі вылажыў 220 долараў. А дарогі там — чорт рогі паломіць.

— Nigdy bym tam dobrowolnie nie pojechał! — абвяшчае нам тонам эксперта. Зараз, вядома, па няволі, за якую яму плацяць тры з паловай тысячы ў месяц, вязе фірмавы гіпс у Малдавію. У Тамашове сустрэнецца з сябрам. Пойдуць у бар, аглянуць любімы тэлесерыял, вып'юць піўцо. Заначуе на аўтастаянцы, а раніцай рушыць на Украіну, пасля ў Малдавію. Вернецца праз тыдзень.

Лешак сталага ўзросту кавалер з Белай-Падляшскай, думае ў дарозе пра сваё здароўе. І пра стравы, якіх яшчэ не пакаштаваў. Яда найбольш захапляе нашага шафёра, можа пра яе гаварыць гадзінамі. Мы, вядома, хмыкаем пры яго расказах пра розныя смакоцці з фазанаў і баклажанаў... Пры нашай поснай дыеце гучаць яны як правакацыя. Каб абараніцца ад грэшнай хвалі прыступаем да атакі:

— А з чыёй кішэні ідуць долары на хабары?

— No, z kieszeni szefa!

(працяг будзе)

Ева Сцепанюк

Дэфармацыя

Ужо 15 гадоў існуе „Дэфармацыя” — пластычны гурток Гайнаўскага дома культуры. Вядзе яго Зінаіда Якуць, выпускніца Мастацкага ліцэя ў Супраслі. Члены гуртка ўдзельнічаюць у конкурсах і заваёўваюць самыя лепшыя месцы ды вылучэнні, атрымліваюць узнагароды. Некаторыя плануюць вучыцца ў Супрасльскім мастацкім ліцэі.

„Дэфармацыя” дзейнічае ў 2 узроставых групах: дзіцячай — ад 7 да 10 гадоў і маладзёжнай — ад 11 ад 15 гадоў. Часам збіраецца такая вялікая колькасць навучэнцаў, што юныя мастакі дадаткова займаюць калідор.

Майстэрня прапануе ўсім заняткі з рысунку алоўкам або вугалем, тушшу, малявання акварэллю, пастэллю, плакатавымі фарбамі, акрылавымі, алейнымі, вітражнымі, а таксама розныя формы графікі і разьбы ды прасторавыя формы.

(мох)

Не праехаць

У вёсцы Бялкі вясною, калі пачынае раставаць снег, ці ў іншую пару года калі пойдзе дождж, па вуліцы цяжка праехаць на машыне ці прайсці пяшком. На пачатку вёскі так пры рабоце апусцілі брук, што не было аніякага адплыву вады. Пасля інтэрвенцыі жыхароў, на брук навезлі жвір, але не наладзілі да канца і цяпер стаіць вялікая калюжына вады без адплыву. Другая калюжына знаходзіцца пасярэдзіне вёскі (ад сядзібы Уладзіміра Рэмжы ў заходнім напрамку). Там ужо некалькі разоў навозілі жвір, на жаль, без рэзультату. Калюжына робіцца ўсё большай, а затым і больш балота на вуліцы.

Падумайце, дарожныя ўлады, пра бялоцкую вуліцу. Жывём у XXI стагоддзі — людзей хочуць пасяліць на Марсе ці іншых планетах — а вы не можаце навесці парадак на вуліцы!

Мікалай Лук’янюк

У Ольштыне

19 сакавіка адбыўся ў Ольштыне мітынг у падтрымку дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі, арганізаваны Форумам маладых ПіС. Дзве гадзіны пасля поўдня на плошчы Яна Паўла II перад ольштынскай ратушай сабралася за паўсотню маладых людзей ад розных польскіх палітычных партый з бел-чырвона-белымі сцягамі. Кароткую прамову сказаў Пшэмыслаў Сабяшэўскі з ФМ ПіС, заклікаючы да пашаны грамадзянскіх правоў у Беларусі. У адказ беларуская мастачка Анастасія сказала:

— Мы ўсхваляваны, што палякі салідарызуюцца з нашым народам і падзяляюць з намі надзею дачакацца свабоднай і дэмакратычнай Беларусі.

Далей удзельнікі мітынгу прайшлі на плошчу Салідарнасці, адкуль выпусцілі бел-чырвона-белыя шарыкі. Мерапрыемства закончыла прамова сенатара ад ПіС Ежы Шміда.

Андрэй Гаўрылюк

Будзённае сяло Кашалі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Алена Пасечнік

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Сцяпан Каляда

Кашалі напамінаюць даўнюю вёску з вузкай вуліцай і шчыльнай забудовай. У сяле шмат драўляных хатаў збудаваных пасля вайны. З-за недахопу месца будаваліся яны ўздоўж вузкіх панадворкаў. Зрэдку відаць большыя мураваныя і драўляныя дамы. Стаяць яны на шырэйшых панадворках, якія ўзніклі пасля пашырэння надзелаў. Раздробленымі пасля шматлікіх сямейных падзелаў былі таксама палеткі, але ў шасцідзесятых гадах пасля ліквідацыі цераспалосіцы гаспадары атрымалі поле ў вялікіх участках і многія разгарнулі тады сельскагаспадарчую прадукцыю.

Пасля вайны крыху сем’яў з Кашалёў нагаварылі на выезд у Расію і там яны асталіся на пастаяннае жыхарства.

— Нам пасля вайны прапанавалі ўступіць у калгас. Аднак людзі бачылі, як жывецца калгаснікам у суседніх вёсках і не хацелі калектыўнага гаспадарання, — гаворыць Мікола Пасечнік, сын Сяргея. — Спачатку цяжка было гаспадарыць, поля ў мяне было мала, але пасля я разгарнуў прадукцыю. Вырошчваў лён, рапс, пачаў гадаваць больш кароў. Хату яшчэ паставіў бацька, а я ўжо канчаў інвестыцыю. Цяжка было гаспадарыць на нашых землях. Месцамі вымакала збожжа, а на іншых палетках знаходзілася гліна і слабы плён быў. Прыбытак мелі ад жывёлагадоўлі і таму мы трымалі кароў, бычкоў і свіней.

На вуліцы ўступаю ў размову са Сцяпанам Калядой. Пасля пераходзім у хату.

— У нас таксама панадворак быў вельмі вузкі і цяжка было на ім будавацца. Пасля дабавілі нам 8 метраў і зараз надзел у нас шырокі на 20 метраў, што дае магчымасць будовы і новых гаспадарчых будынкаў, — кажа Сцяпан Каляда.

Праца ў прадпрыемствах і на полі

Пасля ліквідацыі цераспалосіцы жыхары Кашалёў разгарнулі сельскагаспадарчую прадукцыю і сталі купляць неабходныя машыны. Многа мужчын паступіла тады на работу ў дзяржаўныя прадпрыемствы ў наваколлі Орлі. Жыхары Кашалёў працавалі пры вырабе кафляў ды бетонных канструкцый і наймаліся да разнародных прац у Гмінным прадукцыйным кааператыве. Мужчыны ездзілі на трактарах у Сельскагаспадарчай суполцы і на грузавых машынах у іншых прадпрыемствах. Пасля работы на прадпрыемствах кашалёўцы займаліся сельскай гаспадаркай. Жанчыны найчасцей займаліся домам і жывёлай, мужчыны — палявымі працамі.

— Працаваў я на арлянскіх дзяржаўных прадпрыемствах і пасля работы абрабляў поле. На нашых землях цяжка было разгарнуць сельскагаспадарчую дзейнасць у вялікім маштабе. Хаця ёсць у нас невялікія кавалкі якаснай зямлі, то перапляцаецца яна з пясчанымі і гліністымі палоскамі. На адным кавалку якасць зямлі можа мяняцца кожныя 50 метраў і таму цяжка вырасціць там аднароднае збожжа, — тлумачыць спадар Каляда.

У Кашалях, так як і ў суседніх вёсках, у сямідзесятыя гады цэлыя сем’і займаліся саломапляценнем.

— На ўсю вялікую вёску можа толькі ў пяці хатах не займаліся пляценнем каробак. Амаль кожны жыхар круціў салому, бо за плеценыя вырабы добра плацілі. Я таксама, вярнуўшыся з працы на прадпрыемстве, займаўся пляценнем. Пасля каробкі сталі непатрэбнымі і людзі пакінулі гэты занятак, — успамінае Сцяпан Каляда.

Пасля перамен у Польшчы ўсё адмянілася. Абанкруціліся прадпрыемствы ў Орлі, у якіх працавалі жыхары Кашалёў. Частка моладзі выехала на пастаяннае жыхарства ў Беласток і больш аддаленыя гарады.

Зараз жыхары вёсак у большай ступені карыстаюцца машынамі і звяртаюць увагу на стан дарог. Вадзіцелі з Кашалёў хадайнічаюць у гміннай управе аб асфальтаванні вуліцы ў іх вёсцы.

Доўгачаканы асфальт

— Вакол Орлі асфальтавалі дарогі, а мы асфальту чакалі вельмі доўга. Тлумачылі нам, што дарога, якая праз сяло вядзе ў Рудуты, менш важная і таму яе рамонт адтэрміноўваўся. Цяпер дарога ў Рудуты таксама адрамантаваная і можна бесперабойна ездзіць па ёй на машыне, — кажа спадар Сцяпан і адначасна інфармуе, што водаправод у вёску быў пракладзены даўно.

Кашалёўцы шкадуюць, што не было праведзенае дрэнажаванне іх зямель і ў дажджлівыя гады палеткі падмакаюць. Аднак зараз справы сельскагаспрадукцыі тычацца толькі невялікай часткі жыхароў вёскі.

— Цяпер наша вёска старэецца. Засталося можа 10 гаспадароў, якія па-сур’ёзнаму займаюцца сельскай гаспадаркай. Зараз адзін наш земляроб мае каля 500 гектараў зямлі і займае лепшыя ўчасткі побач суседніх і больш аддаленых вёсак, — тлумачыць Сцяпан Каляда. — Я трымаю яшчэ 4 каровы, свіней і абрабляю поле.

Жыхары Кашалёў, якія працавалі на арлянскіх прадпрыемствах, зараз на пенсіі. Іх дзеці часцяком застаюцца без працы.

— Мая дачка закончыла дзве вышэйшыя ўстановы і не можа ўладкавацца на работу, — кажа мой суразмоўца. — У нашай вёсцы і суседняй Орлі многа маладых беспрацоўных. Некаторыя хлопцы жывуць пры бацьках, дапамагаюць абрабляць некалькі гектараў зямлі і ўтрымліваюцца з іх пенсіяў.

Цікавасць да роднай культуры

Раней у Кашалях было многа падпісчыкаў „Нівы”. Зараз мае суразмоўцы не ведаюць ці ёсць пастаянныя чытачы нашага тыднёвіка.

— „Ніву” я чытаў у мінулым і зараз чытаю. Раней мы выпісвалі беларускую газету, а пасля дзеці пачалі прыносіць яе са школы. Усе яны вучыліся ў Беларускім ліцэі ў Бельску, а пасля падаліся ў вышэйшыя ўстановы, — з ажыўленнем спадар Сцяпан пачынае гаварыць пра наш тыднёвік. — Цікава чытаць артыкулы пра вясковае жыццё ці расказы пра бежанства.

Яшчэ ў шасцідзесятыя гады дзеткі ў Падставовай школе ў Орлі большасці прадметам вучыліся на беларускай мове. Хаця цяпер навучанне роднай мове неабавязковае, кашалёўскія дзеткі таксама вучацца па-беларуску.

— Калі я вучыўся ў Падставовай школе ў Орлі, большасць прадметаў выкладалася на беларускай мове. Толькі некалькім прадметам мы вучыліся на польскай мове, — тлумачыць спадар Сцяпан. — Тады ў нашай вёсцы дзейнічаў гурток БГКТ, у які я таксама ўступіў. У шасцідзесятых гадах ездзілі мы па вёсках і спявалі. Займаліся мы з інструктарам музыкі, які прыходзіў з Орлі. Пазней нашы спевакі аб’ядналіся з арлянскімі і спявалі ў адным калектыве.

— Я таксама вучылася ў школе большасці прадметам на беларускай мове, — уключаецца ў размову жонка, Анна Каляда, якая завіхаецца на кухні. — У мінулым моладзь дружнейшай была. Сустракаліся мы на лавачках і спявалі песні.

Аляксей Мароз

Студэнцкія дні культуры

Алег Кабзар

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Радаслаў Дамброўскі і Ілона Карпюк — арганізатары Студэнцкіх дзён беларускай культуры

— У нас сарганізаваць было б такія дні немагчыма! — кажа Воля Кузьміч з Мінска, якая ў клубе „Фама" ў Беластоку вядзе Студэнцкія дні беларускай культуры. — Хіба што... ночы!

Воля прыехала ў Беласток з групай студэнтаў. Пра тыя студэнцкія „ночы" ведае з досведу — арыштавалі яе за ўдзел у дэманстрацыі, адседзела сваю „паложаную" колькасць сутак на Акрэсціна. У той час яе калегі з курса падыходзілі да залікаў перад абаронай дыплома. Цяпер яна — былая студэнтка пятага курса матэматыкі БДУ. У наступным годзе хоча аднавіцца якраз там, у сябе, хоць тут прапанавалі ёй працяг студыяў. А з Беларусі прыехалі на дні культуры гурт „Неўра Дзюбель" (пратрымалі яго на мяжы ў Кузніцы; за той час, калі чакаўся ён у „Фаме", дала чаду гарадоцкая „РІМА" ў першы, рокавы вечар). Гучны рок і ў выкананні Ілоны Карпюк разам з „5set5" прыцягнуў не толькі маладых беларусаў і палякаў. У кавярні было відаць групкі і сямейныя, і з неюнацкімі ўжо персонамі, менш ці больш вядомымі з беларускай нівы. Для іх студэнцкія музычныя дні былі, як заўжды, нагодай і да ўспамінаў, і да сустрэч адных з аднымі. Іх больш было нават на „цішэйшым" акустычным вечары ў наступны дзень, у суботу, дзе з бардаўскай песняй пад гітару выступіў Алег Кабзар, а таксама Ілона Карпюк з Андрэем Грэсем і Марцінам Кахановічам ды Змітро Язвінскі, які сам адзін моцна трымаў гонар гурту „Рагіс".

Адкуль ідэя і грошы на мерапрыемства? Арганізавалі і падтрымлівалі імпрэзу БАС, Беластоцкі асяродак культуры, Вышэйшая школа публічнай адміністрацыі, студэнцкі парламент універсітэта ў Беластоку, студэнцкі самаўрад Філалагічнага факультэта, „Ніва" і прэзідэнт горада Беластока (Ілона: „Мы добра жывем з горадам!"). Ілона Карпюк, старшыня БАСу, дадае:

— Мяркуем, што праз год можна было б сарганізаваць шырэйшае мерапрыемства разам з Незалежным аб'яднаннем студэнтаў (NZS). Сёння пачула я шмат пытанняў пра „Басовішча". Магу сказаць, што будзе яно 21-22 ліпеня. Звернемся на конкурс у Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, паможа нам і Маршалкоўская ўправа. „Басовішча" мае адбыцца не таму, што такая ўжо традыцыя, але зробім яго такім, якім хочам.

Радаслаў Дамброўскі:

— На нашай імпрэзе паказваем беларускую культуру. Можна было б зрабіць гэта і ў кожным іншым горадзе. Можна было б прывезці яшчэ больш маладых артыстаў з Мінска. Хопіць падацца ў Акадэмію мастацтваў, ёсць там шмат маладых, якіх варта паказаць тут.

На кацнэрце ўспаміналіся „самыя першыя, самыя моцныя, самыя лепшыя" (словы з песні „Васількі" гурту „Рагіс"), перш за ўсё маладыя людзі, якія з голымі рукамі пайшлі супраць тыраніі. Але і жартавалася. Воля Кузьміч вось так раіла, калі б мы раптам нарваліся ў Мінску на нейкіх бандзюгаў: — Не клічце „міліцыя", „ратунку". Дастаткова крыкнуць „Жыве Беларусь", зараз тут як тут будзе і міліцыя, і спецназ, і ўсе, хто вас падтрымаюць, хто будзе з вамі!

Міра Лукша

Якая эканоміка?

Наконт чыгуначнага раскладу язды, які быў уведзены 11 снежня 2005 года было шмат заўваг. Прадстаўнікі Прадпрыемства рэгіянальнай пасажырскай перавозкі ў Беластоку публічна заявілі, што прад'яўленыя прапановы будуць разгледжаны і расклад язды будзе дапасаваны для патрэб лакальнай грамадскасці. На абяцанках закончылася. Ад 1 красавіка на лініі Чаромха — Беласток без перамен. Па-ранейшаму ад'язджаюць з Чаромхі тры цягнікі: у 4.30, 6.40 і 7.33. Пасля абеду ніводнага, хоць пачаткова, у СМІ і Інтэрнэце, быў запісаны цягнік у 14.39 гадз. Каму залежала штодзень пасылаць з Чаромхі трэці ранні цягнік а 7.33, а адмяніць у 14.39? Хто карыстаецца гэтым поездам? Некалькі вучняў бельскіх школ і чыгуначнікаў. А цягнік у 14.39 быў прадаўжэннем курсу рэйкавага аўтобуса Седльцы — Беласток а 13.04 (з Седльцаў). Варта прыкмеціць, што пасля уік-энда, г.зн. у суботу і нядзелю, як і святочныя дні гэтым цягнікам карысталася школьная моладзь (студэнты) з-за Буга і ваколіцы Сямятыч, ды і Чаромхі. Быў ён адным з больш рэнтабельных курсаў на гэтай лініі. Зараз курсіруе тут аўтобус фірмы „Экспрэс-Пагода", які не наракае на „нерэнтабельнасць". Мала таго, насустрач пажаданняў чарамшан прадпрымальнік прадоўжыў лінію з цэнтра Чаромхі (з-пад рынку) на вуліцу Фабрычную. І чыгуначнікі карыстаюцца ў прыватнай фірме льготамі на праезд.

Уладзімір Сідарук

Хто заступіцца?

У выбарчай кампаніі многія палітыкі абяцалі пахадайнічаць за ўвядзенне закону аб рэвальвацыі пенсій. Дагэтуль абавязваючы, паводле працэнтавага каэфіцыента, на думку пенсіянераў, несправядлівы. Прыклад сяголеташні. Ад 1 сакавіка пенсіі ўвялічыліся на 69 зл. Так інфармавалі СМІ. Фактычна, хто мае 400-500 зл. атрымаў 30 (нават менш) злотаў павышэння, а той, у каго звышты-сячная пенсія — на два-тры разы больш. „Бедны становіцца бяднейшым, а багаты багацейшым". У рыначнай эканоміцы цэны для ўсіх аднолькавыя. Сёлета другі раз павысілі цэны газу. Балон для кухні апошнім разам каштаваў 38 зл., зараз, пэўна, больш за 40 зл. плаціць трэба. А што з кватэрнай платай, харчовымі прадуктамі, медыкаментамі? Лепш не гаварыць. Кошт утрымання аднаго парламентарыя месячна каштуе падаткаплацельшчыку больш за дваццаць тысяч злотаў. Сацыяльны мінімум — 800 зл., а на ўтрыманне вязня трэба выдаць з бюджэту дзяржавы больш паўтары тысячы злотаў. І гэтыя апошнія пратэстуюць, быццам з імі не па-чалавечаму абыходзяцца. Дык хто заступіцца за беднага пенсіянера, які ледзь зводзіць канцы з канцамі, або бяздомным ці беспрацоўным? ***(ус)***

У Познані

У Познані ў знак салідарнасці з беларусамі, якія ахвярна змагаюцца за вяртанне дэмакратыі ў Беларусь, вывешана палотнішча з вялікім надпісам „Свабода для Беларусі". Штандар вісіць на помніку Двух Крыжоў, які ўсталяваны ў гонар загінуўшых палякаў, якія змагаліся за свабодную Польшчу ў часы камунізму. Першы крыж сімвалізуе 74 забітых у 1956 годзе дэманстрантаў, дакладна 12 год пасля ўвядзення камуністычнага рэжыму. На другім крыжы віднеюць гады, якія прынеслі чарговыя трагедыі: 1968, 1970, 1976, 1980, 1981. На мачце, што побач з крыжамі, лунае бел-чырвона-белы сцяг. Сцяг і палотнішча былі вывешаны 16 сакавіка ў дзень салідарнасці з Беларуссю і вісяць там аж дагэтуль. Яшчэ ніколі ў гісторыі Познань не быў так заангажаваны ў беларускія справы. Апрача сімвалічных жэстаў Познань выказвае таксама рэальную дапамогу. На навучанне ў гэты горад прыедзе група студэнтаў рэпрэсаваных за грамадскую актыўнасць у Беларусі. У маі, па ініцыятыве Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра і шэрагу іншых арганізацый адсюль паедзе таксама гуманітарная дапамога для найбяднейшых дзяцей у Чарнобыльскай зоне. Актульна, з уладамі горада вядуцца перамовы аб наданні Беларускаму цэнтру сталай сядзібы, што несумненна дапамагло б рэалізаваць шматлікія праекты больш эфектыўна і маштабна.

Віталь Воранаў

Дзень волі

25 сакавіка Таварыства беларускай культуры ў Літве, як заўсёды, урачыста адзначыла Дзень волі. Утульная зала сядзібы ТБК была перапоўнена. Прыгожае афармленне інтэр'ера нацыянальнай сімволікай было выканана мастакамі таварыства. Пасля гімна „Мы выйдзем шчыльнымі радамі" старшыня ТБК распавёў пра гістарычную дату абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі, яе дзейнасць і сучасны стан, зачытаў зварот да беларускай эміграцыі прэзідэнта БНР Івонкі Сурвілы. Затым слова ўзяў заснавальнік беларускай суполкі Латвіі, вядомы мастак Вячка Целеш, які змястоўна распавёў пра святкаванне БНР і справы беларушчыны ў Латвіі.

Аб становішчы на Беларусі пасля гэтак званых „выбараў" распавялі Андрусь Старавойтаў і Алесь Адамковіч.

З прывітальнымі словамі выступілі таксама прапагандыст беларускай культуры ў Літве Валдас Банайціс, настаўніца Алена Забельская і мастак Станіслаў Зялёнка.

На жаль, запрошаныя паважаныя госці з Беларусі Уладзімір Арлоў, Зінаіда Бандарэнка, Віктар Шалкевіч і другія ў апошні момант паведамілі, што ў сувязі з драматычнымі падзеямі, звязанымі з жорсткім разгонам сілавымі структурамі рэжыму ўдзельнікаў дэманстрацыі „За свабоду, праўду і справядлівасць" не змаглі прыехаць у Вільню.

Хведар Нюнька

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 21 -

Гражынчын тата збірае паштовыя маркі. Бабуля — цікавыя ўзоры ручнога вязання кручком і пруткамі; у ейнай шафе — поўна часопісаў, рысункаў і сплеценых, выгафтаваных і вышытых сурвэтак, каўнерыкаў, абрусоў, блузак, фартушкоў... Можна было б абдзяліць усю гміну, смяецца бабуля. Мама — часопісы аб модзе. У мамы ёсць журналы мод нават вельмі старыя — даваенныя яшчэ. Кажа, усё заўжды моднае — трэнды вяртаюцца, і з кожнага можна самой выдумаць яшчэ штосьці такое цікавае, каб і быць іначай апранутым ад іншых, хоць па апошнім крыку моды. Цікавіць гэта і Гражынку, але яе больш вабіць макіяж. Час ад часу марыцца ёй прыгожа памаляваць свой твар і выйсці так на вуліцу. Ды якое гэта маляванне — Грак узіраецца, як мама ды бабуля пэцкаюць сабе павекі каляровымі фарбамі, на вейкі шмаруюць нейкім пруцікам з валосікамі туш, на шчокі — румяну ды пудру, а вусны — пэндзлікам або памадай ды алоўкам абводзяць. Якое гэта памаляванне твару! Памалявалі б усю чорнай тушшу — гэта мела б выгляд. Або ў плямкі ці палосачкі — такая карціна ў стылі Лявона Тарасэвіча: вось гэта было б мастацтва! Бо Грака цікавяць каляровыя алоўкі. Розныя — васковыя, пастэль, а найболш звычайныя, дзе ў драўлянай асадцы схаваны каляровы сардэчнік. Грак у кардоне за занавескай назбіраў каляровых алоўкаў як дроў! Вельмі цікава іх вастрыць — бярэш дзюбай за кончык, і точыш. Драўляная стружка сыплецца па баках (тады нельга ўдыхваць, бо набрацца могуць пілавінкі ў лёгкія і во як накашляецца Грак, плюючыся каляровым пылам!), на чорныя крылы асядаюць пастэльныя пылінкі. Бывае, Грак так захопіцца тачэннем „крэдак" у кутку на акне, што на заслоне ўзнікаюць вясёлкавыя далікатныя экзатычныя кветкі. Але ж прыбраць тое цуда-мастацтва час ад часу трэба.

Найчасцей за генеральнае прыбіранне людзі бяруцца пад свята. Тады, вось, выганяюць з найбольш скрытных закуткаў прытоеныя там „каты". Грак з неспакоем узіраўся, як Гражынка валачэ ў ягоны запаветны кут „пылацмока". Пыласос, які наводзіў на Грака заўсёды дзікую паніку, зароў і стаў хапаць усё, што было на яго дарозе — пыл, паперкі, стружкі, нейкія аскепачкі... „О, мае скарбы, мае аловачкі!" — залапатаў Грак над страшным пылацмокам і адважна ўхапіў у дзюбу з-пад яго доўгага носа ў апошнюю хвіліну апошні цэлы, чырвоны як мак аловак.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Беластоцкія навучэнцы беларускай мовы на дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова"

Вершыкі з Дубіч

Дарагая „Зорка"!

Прашу, не глядзі на гэтыя вершы вокам літаратурнага крытыка, а як на Словы малых беларусаў, якіх свет яшчэ не „перахрысціў". Калі будзе ў Вас магчымасць надрукаваць іх вершы, гэта будзе для дзяцей вялікай узнагародай і доказам, што варта вывучаць беларускае слова.

З павагай

Мар'я Казімірук
настаўніца беларускай мовы ў Дубічах-Царкоўных

Восень

Людзі бульбу капаюць
Агародніну хаваюць
І прытым спяваюць:
„Эх, вы людзі маладыя,
вашы дарогі крутыя
восень, восень залатая
прыйшла да нас
дарагая"

Марта Федарук, III клас

Зіма

Куртка, шапка
На двор марш.
Надышоў ужо час
У снежкі гуляць.
З неба снег цярушыць
Вясёлым дзецям
Мёрзнуць вушы.
Гэта зімовы час
Акружае нас.
А на свеце так бывае,
Што сонейка
Зямлю сагравае.

Моніка Хадакоўская, IV клас

* * *

Зіма...
Дык што дзецям рабіць?
— снежную бабу ляпіць.
— Мішку ў снезе качаць?
А потым...
Ну, дык што потым?
— чыхаць і ад болю крычаць.

Якуб Шыманюк, IV клас

Зіма

Прыйшла халодная зіма
А ў мяне цёплага паліто няма.
Будуць мерзнуць ручкі, ножкі,
Трэба рабіць бамбошкі.
Буду прасіць бабку,
Каб зрабіла і шапку.
Потым пайду на падворак
З'язджаць на санках з горак.

Анна Ярымовіч, IV клас

Сабачка

Скача сабачка на двары
Хоча з кім-небудзь
Пагутарыць
Скочыць тут
Скочыць там
Ніхто яго яшчэ
Не пакараў
Прыйшоў бацька
Накрычаў
Што сабачка выраблЯў
Што ўвайшоў ён
У агарод
Перавярнуў
Увесь... народ

Марта Федарук, III клас

Бабулін хлеб

Расчыніла бабуля хлеб
Распаліла печ
Хлеб расце, расце
З бляшак уцякае
Бабуля ў печ
Яго саджае
Пахне хлеб
На цэлы дом
Бабуля з'ела
Яго з малаком.

Уля Баравік, III клас

Бусел

Вясна наступае
Наш бусел прылятае
Свайго гнязда шукае
Весела клякоча
І жабак есць ахвотна
А калі восень
У агарод заглядае
Смутак за сэрца хапае
Бусел у вырай
Ад нас адлятае

Уля Баравік, III клас

Галерэя беластоцкіх дэкламатараў

Філіп Хомік

Мацей Севастыянік

Пятрусь Стэльмашук

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Міхась Хмялеўскі

Тры Паўліны і Паўл

Канцэрт раскруціўся пасля гадзіны, калі на сцэну выйшаў „Н.Р.М.". Над галовамі залуналі бел-чырвона-белыя сцягі. Публіка шалела і спявала разам з салістам...

— *О, ла-ла, ла-ла! Ты не чакай, сюрпрызаў не будзе!*

Паўліна Ш. не чакала сюрпрызаў.

Пасля трэцяй песні яна выбегла на панадворак, каб глынуць паветра. Гімназістка пакудлачыла свае валасы і выглядала быццам ракменка.

— Ты, *Кася Кавальская*! — пачуліся ў яе бок словы. Сярэдзінай калюжы, у яе бок, хісткім крокам, набліжаўся маладзён. У адной руцэ трымаў пляшку, у другой — сок „Фартуна".

— Напіся са мной, мая зорка, другой такой нагоды ўжо не будзе, — сказаў тонам, які не пераносіць супраціву і стаў тыцаць сваю пляшку ашаломленай Паўліне Ш.

— Я-я дзякую! Я не люблю гарэлкі! — аднеквалася наша хіпі.

— А я цябе люблю, — нахабнічаў незнаёмец.

— Я-я, я таго... я не паважаю такіх хлопцаў, — прамовіла рашуча хіпі і ў яе голасе прагучала агрэсія. Яна падумала, што калі нахабнік не перастане махаць перад носам сваёй пляшкай, кіне яго ў лужу.

— Я маю ўсе твае кампакт-дыскі, — цягнуў гутарку незнаёмы, а пасля шчыра стаў захапляцца песнямі Касі Кавальскай. Паўліна Ш. ніколі не думала, што памыляць яе з зоркай рок-эстрады. І ёй захацелася смяяцца, аднак, не зрабіла гэтага, каб не патраціць бойкага выгляду.

— Я таксама ракмен, — даказваў фан і па-воўчы стаў напяваць песні з рэпертуару згаданай зоркі.

— Пакінь гэтую дзяўчыну ў спакоі, — прасіпеў з цямрэчы голас. П'яны маладзён здрыгануўся, але не адставаў.

— Астаў яе, — бо не ведаю што зраблю! — зноў гукнуў голас. З-за вугла паказаўся знаёмы нам рыцар. Паўл хацеў ужо распраўціца з нахабнікам, але апярэдзіла яго Паўліна Ш. Адным трапным рухам збіла незаёмага з ног і выкруціла яму руку.

— О-го-го! — захапіўся яшчэ больш ёй незнаёмы фан.

Пасля ўсе сябры смяяліся, а Паўліна Ш. танчыла і спявала як шалёная.

(працяг будзе)

Арабінка

Польска-беларуская крыжаванка № 16

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 12: Блакіт, погляд, рад, сава, сшытак, пяюн, воўк, жанр, халяўка, пшанічка, прыгода, лек, прырода, сіла, фрыз, Уля, рыс, аз, вяснянка. Ас, шпак, пра, Ян, прыз, сюрпрыз, кран, шыр, ха, год, анод, Ліда, свяча, шоўк, Ян, грыўка, латка, ліра, яда, белы, кіт, каса.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі: **Адам Харкевіч, Эвеліна Бірыцкая, Агата Барэчка, Лукаш Марчук** з Нараўкі, **Эвеліна Ігнацюк, Паўліна Башун** з Чыжоў, **Рафал Скепка, Мартына Сакалоўская** з Дубін, **Якуб Андрацкі** з Саколкі.

Віншуем!



Вершы Віктара Шведа

Усыпляе сынка маці

Усыпляе матка
Малога сыночка
І просіць дзіцятка:
— Заплюшч свае вочкі.

А калі часамі
Пройдзе сон багаты,
Крыкні толькі „мама!",
Прыбяжыць твой тата.

Паставіў хворага на ногі

— Пра добрага лекара згадка —
Пачулі ад хлопца малога.
Сказаў ён, што нашага татку
Паставіць хутка на ногі.

— Паставіў? Дык малайчына!
Хваліць лекара Жэня.
— Прадаў наш татка машыну,
Каб грошы аддаць на лячэнне.

Кантроль білетаў

Аўтобус фыркае няспынна,
Нейкі за ім бяжыць мужчына.
Верыць, стрымаюць людзі скора
Непаслухмянага шафёра.

Аўтобус сапраўды спыніўся,
Мужчына клямкі учапіўся,
І ўжо аддыхаўшыся гэтак,
Ён закрычаў: — Кантроль білетаў!

Памежная проза

У сакавіку ў пісьменніка з Беласточчыны Міхася Андрасюка выйшла трэцяя кніга прозы „Белы конь". Яна аб'ядноўвае дзевяць лірычных навелаў пра лёсы сямейнікаў вялікай сям'і Іванюкоў, што па другой сусветнай вайне апынулася ў Польшчы — дзяржаўная мяжа прайшла пасярэдзіне сядзібы Уладзіміра Іванюка. Усе навелы з кнігі аб'яднаныя ў фармат аповесці, хаця сам аўтар „Белага каня" кажа, што кніга ад пачатку пісалася як зборнік апавяданняў.

Яшчэ нядаўна не верылася, што пасля Сакрата Яновіча Беласточчына бліжэйшым часам народзіць новага празаіка. Але вось ён ужо ёсць. Піша, выдае кнігі. Са сваім стылем — акварэльным, навелістычным, іранічным, з адметным гумарам. Прынамсі, у Беларусі я не ведаю з кім яго можна параўнаць.

Уяўляю, як цяжка пісаць пра невялічкае мястэчка Гайнаўка, якое паўстала 50 гадоў таму, пасля таго, як у ваколіцы Белавежскай пушчы змайстравалі тартак і ў якое паз'язджалі сяляне, якія апынуліся пры мяжы, як у тупіку.

Але Андрасюк не стамляецца, не вычэрпваецца.

Новая кніга выйшла ў серыі бібліятэкі Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа" пры фінансавай дапамозе Міністэрства культуры Польшчы.

30 сакавіка ў Гайнаўцы адбылася прэзентацыя кнігі Андрасюка. На ёй прысутнічалі не толькі жыхары мястэчка, але і госці з Мінска (група ліцэістаў на чале з Леанардай Мухінай) і гродзенскі бард Віктар Шалкевіч.

Як тое і мусіла быць — землякі першыя паспрабавалі ацаніць новую кнігу свайго ўласнага пісьменніка.

Алесь Аркуш

Уладзімір Саўчук

* * *

Не накорміш бяды
не пасцелеш вады
расплываецца ў нас баламута

хто каго і за што
лаяць мог без пары
існуе недахоп для рэкрута.

Камісары „байцы"
не змаглі вас бацькі
згандлявалі рускае слова

ну прыйшла ўжо пара
на дыялог за сталом
аджыла беларуская мова.

Хто не ў сіле пражыць
за мяжою разгляд
зацвітае балюча каліна

гэта погляд вясны
на жыццё беларусаў
тут малая наша айчына.

Ганьба! ганьба! — усім
хто спаганіў народ
і пакіне сляды прымацкія

над усім тым жыццём
рэжым строгі вядзе
старая мачаха Р..ія.

23.03.2006 г.

З Вільні спаглядаючы

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Выступае Ян Сянкевіч

Размова з Янам СЯНКЕВІЧАМ, гісторыкам з Вільні.

„Ніва": — Паявіліся Вы ў Беластоку на навукова-літаратурнай канферэнцыі „Значэнне польска-беларускіх літаратурных сувязей — учора, сёння і заўтра", у гарачы час для Беларусі, а не змаглі чамусьці трапіць на яе чаканыя беларускія госці. Ваш даклад — „З Віленшчыны аб польска-беларускіх сувязях. Надзеі і рэчаіснасць". Гэта зусім не навуковы „элабарат".

— Няма ў мяне схільнасцей ці кампетэнтнасці, каб польска-беларускія ці польска-літоўска-беларускія справы высвятляць навукова, гістарычна і аб'ектыўна. Адразу я агаворваюся, што ёсць і буду суб'ектыўным і небесстароннім. Суб'ектыўнасць вынікае выключна з асабістых досведаў. Небесстаронні — паколькі я з тае *стараны*, дзе пануе перакананне наступнае: так у нашым старонні — у Вільні, Гродне, Навагрудку, Беластоку — усё стагоддзямі свойска пранікалася, перапляталася і вязалася, што сёння няма больш аб'ёмістага лозунгу, лепшай платформы супольнага існавання, супольнага мышлення і супольнага дзеяння, як *свойшчына*. Мабыць, яшчэ ўзбагачаная ў *тутэйшасць*.

— Такія катэгорыі не прызнаюць межаў?

— Ні савецкіх, ні постсавецкіх, ні еўрасаюзных — ніякіх. І няма іх як азначаць пры дапамозе „мудрацовага шкельца", затое дасканала функцыянуюць яны ў міжчалавечых адносінах. Яны глыбока трываюць у свядомасці і ментальнасці, снуюць ніць супольнасці паміж людзьмі пражываючымі ў гэтым рэгіёне. На Віленшчыне ў найшырэйшым разуменні тэрыторыі. Можа, лепш — гэта Вялікае княства Літоўскае. Хоць пасля ВКЛ былі цары белыя і чырвоныя, межы на картах перарысоўвалі не раз, тая супольнасць — усё жывая. Змяняюцца ўлады і лады, прападаюць і паяўляюцца дзяржавы, а чалавек з-пад Вільні знойдзе супольную мову з кімсьці з-пад Гродна, Беластока ці Маладзечна хутчэй, чым з-пад Коўні ці Панявежа. Думаю, што і той з-пад Беластока лепш дагаворыцца з тым з-пад Ашмяны ці Навагрудка, чым, скажам, з Познані ці Кракава.

— Цяпер мы грамадзяне трох краін.

— Няма як гаварыць ад стасункаў двух- ці трохбаковых. Геаметрычна гэта не быў бы трохкутнік, а круг. Круг супольнай рэгіянальнай культуры, моўных падабенстваў, часам глыбока схаванага пачуцця рэгіянальнай тоеснасці. Калі гэта пратрымалася столькі стагоддзяў, будзе існаваць далей. Разважаючы ў такіх катэгорыях, менш істотным становіцца хто і якую ў якойсьці з гэтых частак мае ўладу, якая дзяржаўная мова ці які лад. Супольнасць застаецца. Я б рызыкнуў тэзу, што якраз тут, у нашым старонні, пратрымалася аўтэнтычная ў змесце ідэя Вялікага княства, у якой калі захопнасць — дык толькі сэрца, калі экспансія — дык культуры, а калі заваёвы — то выключна любоўныя. Аб гэтым я штосьці ведаю, бо і ў маёй сям'і дзве асобы народжаныя ў Беларусі і дзве ў Літве. І нашы ўсе яны, няма што спрачацца — і Мікола Гусоўскі, і Міхал Казімір Агінскі, і Тадэвуш Касцюшка, і Адам Міцкевіч, і Кастусь Каліноўскі, і Станіслаў Манюшка. Як і ўсе іншыя выдатныя і заслужаныя сыны гэтай зямлі.

— У Вашай радзіннай мясцовасці, у Шыланскай парафіі, на якой мове гаворыцца?

— Нейкі час таму трапіла мне ў рукі старая кніга аб беларускай мове. Была ў ёй карта, якая паказвала абшар беларускай мовы, калі нават не ўжыванай, дык адціскаючай свой уплыў на іншыя мовы. А мой радзінны засценак якраз пры мяжы гэтага абшару, на стыкоўцы насычанай беларушчынай пальшчызны з літоўскай мовай. Вільня ляжыць у гэтым абшары досыць глыбока. Існаванне стагоддзямі побач сябе дзвюх моў — польскай і беларускай — дало плод сапраўды ў непаўторным смаку — віленскую пальшчызну. Цяпер гэтыя мовы ў маім старонні суіснуюць больш бяседна і ў пагаворках. Спяваюцца „O mój rozmarynie", „Przybyli ułani pod okienko", „Касіў Ясь канюшыну", „А Лявоніха ні жонкай была", а папулярныя пагаворкі — „Адзін з'еш хоць вала, усё раўно адна хвала".

— На студыі выправіліся Вы ў Мінск.

— Поўны я быў павагі для беларускай мовы, бо ж гэта мова Вялікага княства, ды чакала мяне прыкрае здзіўленне. На семінарах па беларускай літаратуры адно я адзін, з Літвы, размаўляў з выкладчыкамі па-беларуску. У Мінску не было ні адной беларускай школы. Знайшоў я праз нейкі час пару калег з іншай школы, якія нават пісалі штосьці па-беларуску, выдалі нават часопіс у пяці экземплярах, ды зацікавіліся ім улады, добра, што толькі вучэльні. Кончылася гэта тым, што хлопцаў выкінулі з інтэрната.

— Ці сёння нешта змянілася ў Беларусі? Магчымыя нейкія рэвалюцыйныя змены?

— Лічу, што так, і будзе ісці да лепшага. Гаворыцца шмат аб беларускай рэвалюцыі — адны аб яе патрэбе, іншыя — што да яе не дапусцяць.

— А аб беларускай апазіцыі?

— Або што слабая і нешматлікая, або што гэта інструмент у чужых руках. Думаю, што рэвалюцыйнае вырашэнне малапраўдападобнае. Не па прычыне такой ці іншай пазіцыі ўлад, а глыбокіх траўм саміх беларусаў, іх досведаў з недалёкага былога. Каб пасля вайны, дзе загінуў кожны чацвёрты жыхар, дайсці да сябе, трэба часу. Я б не здзіўляўся, што беларусы адчуваюць антыпатыю да таго, што асацыюецца з насіллем.

— Апазіцыя гэта не толькі лідэры...

— ...маніфестацыі, транспаранты, лозунгі. Гэта праца не ад учора над зменай ментальнасці беларусаў, над узмацняннем павагі да саміх сябе, уласнай годнасці, тоеснасці, мовы, мінулага. Можа калісьці здзівімся, як многа ўжо зроблена. Дзяржава гэта не толькі гаспадарка, прамысловасць, сацыяльныя справы. Апрача энерганосьбітаў, эканамічнага патэнцыялу, ёсць яшчэ ўнутраная энергія народа, яго духоўны, інтэлектуальны патэнцыял. Калі спаглядаць з Вільні, ідзе гэта ў Беларусі ў добрым напрамку. І Беларусь стане сапраўды незалежнай, з вернутай гістарычнай Пагоняй, нацыянальнымі колерамі дзяржавай. Няма сумненняў. І зваліцца свежая жалезная заслона, якая дзеліць сёння на кавалкі Віленшчыну.

Размаўляла Міра Лукша

Дырэктар — цэнзарам

Заняткі вядзе Пётр Скшыпашэк, трэнер Amnesty International

У Белавежы і Гайнаўцы тры дні на пераломе сакавіка і красавіка праводзіўся Аб'язны фільмавы фестываль Хельсінскага фонду правоў чалавека, сарганізаваны пад лозунгам „Правы чалавека ў фільме". На паказ дакументальных фільмаў, якія датычылі гэтай праблематыкі ў Беларусі, дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры Ян Карпюк якраз у гэтым месцы не даў згоды.

Гэты фестываль быў адным з праектаў рэалізаваных студэнтамі Паўшэхнага універсітэта імя Яна Юзафа Ліпскага ў Тэрэмісках, заснаванага Яцкам Куранем і ўтрымліванага фондам яго імя. Мэтай фестывалю было прыбліжэнне публіцы праблематыкі правапарушэнняў, паказанай у дакументальных фільмах м.інш. з Польшчы, ЗША, Расіі, Беларусі і Афрыкі. Пытанні права на свабоду, годнасці і недатыкальнасці асобы аўтары фільмаў прадстаўлялі вельмі сур'ёзна, але і, бывала, у гумарыстычны спосаб, як хоць бы ў „Адным дні ў ПНР" Мацея Дрыгса (аб польскіх-камуністычных абсурдах у выбраны дзень — 27 верасня 1962 г.) ці „Гноміках, што ехалі на Украіну" Міраслава Дэмбінскага (аб падтрымцы маладых палякаў Аранжавай рэвалюцыі на Украіне). З-за рашэння дырэктара гайнаўскага Музея і асяродка беларускай культуры не маглі ў ім быць паказаны ў рамках фестывалю кінакарціны Віктара Фанайлава „Хімія па-беларуску" аб правапарушэннях у Беларусі, „Беларускі Дэкамерон" аб Беларусі бачанай у чатырох навелах праз прызму гісторыі жанчын ды „Апошні дыктатар Еўропы" Юрыя Каліны, які распавядае пра ўладаранне Аляксандра Лукашэнкі. У апошні дзень фестывалю гэтыя фільмы паказваліся ў Белавежскім асяродку культуры. Дарэчы, падобна як і два іншыя „Як Пуцін прыйшоў да ўлады", зрэалізаваны ў Вялікабрытаніі Таняй Рахманавай ды „Coca", які дакументуе правапарушэнні ў Чачні. І падобна як там, не было і тут месца на прэзентацыю здымкаў аб паслявыбарчых падзеях у Беларусі.

— Ва ўсе фестывальныя дзеянні ўключылі мы студэнтаў нашага Універсітэта. Падзяліліся мы на чатыры групы. Гэта для таго, каб студэнты пры гэтай нагодзе вучыліся. І гэта дае вынікі. Адна з нашых студэнтак робіць падобны фестываль у сябе, у Жыўцы, — расказвае Каміла з Алясніцы, адна з суарганізатарак фестывалю ад Універсітэта.

Кацярына Вінярская, выкладчыца Універсітэта, якая займаецца шматкультурнасцю, у рамках заняткаў „Oikumene", а заадно адна з заснавальніц школы ў Тэрэмісках, дадае:

— Калі нашы студэнты маюць быць аніматарамі грамадскага жыцця, павінны гэтаму вучыцца на практыцы, а такі фестываль — добрая нагода. Другая мэта, якая вынікае з ахвоты даць штосьці гэтай супольнасці, сярод якой мы тут прабываем.

Кацярына дадае, што баялася пытання, чаму адна частка фестывалю праводзілася ў Гайнаўцы, а другая ў Белавежы:

— Гэтае пытанне папраўдзе дык да дырэктара Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы. Выбраў ён з праграмы толькі некаторыя прэзентацыі. Не пагадзіўся на беларускую частку.

Дваццацідвухгадовы Адам са Свідніцы, студэнт першага курса школы ў Тэрэмісках, падзяліўся з намі сваімі ўражаннямі ад фільмаў:

— Жахлівыя былі расказы асабліва пра дзяцей, як, напрыклад, аб маскоўскіх дзецях з вуліцы „Дзеці з Ленінградскага". Я ў шоку. Хоць я хлапец, цяжка было мне ўстрымацца ад выяўлення сваіх эмоцый, плачу.

Што ты, малады чалавек, можаш зрабіць, каб у свеце не даходзіла да парушэнняў правоў чалавека?

— Мушу пачаць ад сябе, — каб самому ўшаноўваць правы іншых людзей. Апрача таго можна дзейнічаць у *Amnesty International*. Я не магу таго зразумець, чаму ў Беларусі людзей прыгнятаюць і ў вялікай ступені па іх уласнай волі. Пэўна, гэта таму, што яны не ведаюць цалкавітай свабоды, значыць, па ёй не тужаць. Лукашэнка гарантуе пенсію і ім здаецца, што ўжо ўсё добра. А можа быць яшчэ лепш.

Фестывалю спадарожнічалі заняткі на тэму „Што гэта такое правы чалавека". Вядучы іх Пётр Скшыпашэк, трэнер *Amnesty International*, працаўнік Універсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай у Любліне тлумачыў „Ніве" іх ідэю:

— Гэта была ахвота схіліць да некалькіх рэфлексій на падставе назіранняў самога сябе. Справа перш за ўсё ў рэфлексіі: я гляджу на свет стэрэатыпна.

І дадаў:

— Калі людзей не ведаем, карыстаемся стэрэатыпамі. Увесь час у Польшчы пануе адмоўны стэрэатып наконт меншасцей. Вынікае гэта таксама з тае няўдачы, якая трапілася Польшчы пасля апошняй вайны, калі яна са шматкультурнай дзяржавы стала краінай амаль суцэльна аднанацыянальнай.

Зазначыў таксама:

— За апошнія некалькі месяцаў змяніліся адносіны палякаў да беларусаў. Панаваў стэрэатып, згодна з якім невядома было, хто такі беларус, нейкі рускі, якога асабліва не цікавіць уласны лёс, нічога ён не робіць. Дзейнасць беларускай апазіцыі і тая салідарнасць палякаў спрычынілася да таго, што ў агульнай уяве аказалася, што ўсё іначай. Шмат залежыць ад палякаў і розных арганізацый, каб паказаць, што гэта нічога благога быць беларусам, што варта цешыцца ў Польшчы тым, што ў нас ёсць беларусы.

У Белавежскім доме культуры пры нагодзе фестывалю была адкрыта фотавыстава народжанага і выхаванага ў эміграцыі тыбетца Ташы Лангду. Гэта запіс ягонага першага візіту ў Тыбет, жорстка акупіраванага Кітаем, у жніўні 2003 г. Шмат здымкаў паказваюць месцы раней не бачаныя людзьмі Захаду і ўплыў кітайскай акупацыі на кожны аспект жыцця тыбетцаў.

„Правы чалавека ў фільме" карысталіся ў першы дзень немалым зацікаўленнем, у два апошнія ўжо меншым. У Гайнаўцы можа таму, што дырэктар Музея і асяродка беларускай культуры вырашыў так а не іначай. Можна было тут тады ўбачыць фільмы аб пошуках прапаўшых у Косаве і Босніі, гомасексуалістах, якія ў ЗША атрымалі прытулак, кантралёрах Нокіі ў адной з кітайскіх фабрык.

— Беларускую тэматыку ацэнзуравалі, — адназначна назвала адна з асоб блізкіх музею, якая ўдзельнічала ў паказах.

Яўген Янчук, старшыня Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, які завітаў у Белавежу, сказаў:

— Гэты фестываль — шанц даказаць людзям, якія тут пражываюць, што кожны чалавек мае права на свабоду, на выказванне сваёй думкі, волі. Нават у Еўропе сёння здараецца, што парушаюцца асноўныя чалавечыя правы. Найлепшы прыклад — дыктатура ў нашага суседа — Беларусі. Сімпатыя для народа, якая атоесамліваецца з сімпатыяй для дзяржавы, у выпадку Беларусі ці Расіі, аб якіх трактуюць фільмы паказаныя ў Белавежы, гэта штосьці зусім іншае. Няма там адкрытага грамадства з рэальным уплывам на кіраванне. Эліты ўлады кіруюць для саміх сябе, ствараючы апарат насілля, апарат зла.

Тэкст і фота Раіны Стэфанчук

Юбілейныя ўспаміны

Пяцідзесятая гадавіна заснавання „Нівы" і Беларускага грамадска-культурнага таварыства, якая адзначаецца сёлета, прыводзіць мне на памяць пачаткі іншай арганізацыі, а менавіта Рускага культурнага таварыства (Русского культурного общества) і яго друкаванага органа — газеты „Русский голос".

Рускае таварыства сваім уплывам ахоплівала расіян, якія пражывалі ў Польшчы. Меркавалася, што было іх тады каля 60 тысяч плюс 90 тысяч лэмкаў, якія лічылі сябе „рускімі", а не ўкраінцамі. Членамі РКО была невялікая частка гэтай этнічнай групы, але ў культурным жыцці, у клубах займалася значная іх колькасць, асабліва ў вялікіх гарадах, такіх як Лодзь, Кракаў ці Варшава. Рускія клубы гуртавалі таксама беларусаў, асабліва ў тых гарадах, дзе не было аддзелаў БГКТ. Так было, напрыклад, у Лодзі, дзе знаходзілася сядзіба Галоўнага праўлення РКО і рэдакцыя „Русского голоса", якога нязменным рэдактарам быў пакойны Панцеляймон Юр'еў. У сваіх успамінах многа ўвагі ён адвёў перыяду рэдагавання рускай газеты, паказаў складанасці, якім гэтая газета з пачатковым 15-тысячным тыражом пастаянна падвяргалася. Заўсёды бракавала паперы, вытворчых магутнасцей у друкарні, адпаведнага шрыфту ці ўрэшце наборшчыкаў, якія патрапілі б набраць рускі тэкст. Шмат кіёскаў адмаўлялася прадаваць газету, а калі і бралі яе дык хавалі пад іншыя выданні, каб толькі чытач яе не заўважыў.

Дзяржаўныя ўлады таксама пастаянна абмяжоўвалі маштаб дзеяння як самога таварыства, так і газеты. У палове 1960-х гадоў удалося ім здушыць газету, а некалькі гадоў пазней і само таварыства. Апошні старшыня Галоўнага праўлення РКО, пастаўлены партыйнымі ўладамі з задачай ліквідаваць таварыства, быў такім расіянінам, як маршал Ракасоўскі палякам. Партыйную задачу выканаў ён тэрмінова...

Думаю, што частка гэтых праблемаў вядомая была таксама рэдактару Георгію Валкавыцкаму. **М. Ц.**

Мовы нараджаюцца, развіваюцца, знікаюць, пакідаючы пасля сябе сляды ў новых мовах і культурах іншых народаў. Мовы змяняюцца да непазнавальнасці...

http://mab.org.by

Вывучэнне кожнай мовы немагчыма без сталага навукова абгрунтаванага падыходу. Шматмоўе свету паказвае, што гэтая галіна навукі ніколі не застанецца без увагі да яе. Мовы нараджаюцца, развіваюцца, знікаюць, пакідаючы пасля сябе сляды ў новых мовах і культурах іншых народаў. Мовы змяняюцца да непазнавальнасці, але гэтая непазнавальнасць толькі на першы погляд. Навуковаму воку адразу бачныя тыя рысы, што робяць тую ці іншую мову ўнікальнай. Для таго, каб усе моўныя веды не згубіліся з навуковай скарбніцы свету, ствараюцца разнастайныя арганізацыі вучоных, зацікаўленых у захаванні гэтых ведаў для будучых пакаленняў. Адна з іх — Міжнародная асацыяцыя беларусістаў (МАБ).

Каб падрабязней пазнаёміцца з дзейнасцю асацыяцыі, варта зазірнуць на яе сайт, які толькі сёлета з'явіўся ў Інтэрнэце па адрасе: http://mab.org.by. Віртуальнае прадстаўніцтва МАБ без перабольшвання годна адлюстроўвае яе міжнародны характар. Уверсе выяўлення назва сайта — аднайменная з назвай арганізацыі. Яна размешчана на карце Еўропы, дзе на белым фоне чырвоным колерам пазначана тэрыторыя Беларусі.

Далей ідзе традыцыйнае дзяленне вэб-старонкі на тры часткі.

Аб тым, што ўяўляе з сябе МАБ, выдатна сказана ў невялікім паведамленні пад гучным назовам „Наша місія": „Прызначэнне Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, — пішуць стваральнікі сайта, — садзейнічаць развіццю беларусістычных даследаванняў у галіне гуманітарных і сацыяльных навук, выступаць як сховішча інфармацыі, датычнай беларусістычных штудый, спрыяць выкладанню беларусазнаўчых дысцыплін за межамі Беларусі, палягчаць міжнароднае супрацоўніцтва паміж навукоўцамі і інстытуцыямі ва ўсім свеце". Мэты годныя і, зважаючы на сённяшні цяжкі стан з беларускай мовай, амаль недасяжныя. Але, як кажуць: вочы баяцца, а рукі робяць. І дасягненне вышэйазначаных мэтаў ужо не падаецца такім немагчымым. Для гэтага варта зазірнуць на іншыя старонкі сайта.

Наступнай пасля галоўнай старонкі ідзе рубрыка „МАБ". Калі клікнуць на яе, то адкрываецца некалькі падрубрык. Праўда, не ўсе яны працуюць. Так, старонка „Гісторыя" пакуль не дазваляе даведацца пра мінулае беларусістычнай арганізацыі, якая існуе ўжо 15 гадоў. Аб гэтым сведчыць статут МАБ, які размешчаны пад аднайменнай падрубрыкай. На старонцы таксама прадстаўлены персаніфікаваны спіс кіраўніцтва камітэта арганізацыі. Азнаёміцца з яго рашэннямі, на жаль, пакуль немагчыма, бо старонка з дакументамі арганізацыі ў распрацоўцы.

Найбольш цікавай падаецца рубрыка „Навіны", асабліва падрубрыка „Што адбудзецца". Тут госць віртуальнага прадстаўніцтва МАБ можа даведацца аб тых навуковых канферэнцыях, што пройдуць бліжэйшым часам па пытаннях беларускай мовы. Дарэчы, прадастаўляецца магчымасць не толькі даведацца, але і запоўніць адпаведную заяўку на ўдзел у падобным мерапрыемстве.

Паколькі з гісторыяй асацыяцыі ў лаканічным расповедзе пазнаёміцца немагчыма, то гэта ў нейкай ступені можа быць кампенсавана праглядам архіва бюлетэня, які выдае МАБ. Праўда, электронны архіў бюлетэня месціцца на старонцы „Навіны", а не ў рубрыцы „Архіў", якая практычна нераспрацаваная і дзе з трох падрубрык працуе толькі адна — „Бібліяграфія" са скарыназнаўчай інфармацыяй.

Уладзімір Лапцэвіч

Не спраўдзіліся ружовыя надзеі беларускіх аматараў тэніса. У чвэрцьфінальным матчы Кубка Дэвіса з Аўстраліяй Максім Мірны і Уладзімір Ваўчкоў стараліся як маглі...

Беларусь, беларусы...

„Юнацтва" мацней старасці

14-ы адкрыты чэмпіянат Беларусі па хакеі завяршыўся чарговай перамогай мінскай каманды „Юнацтва". У паўфіналах серыі плэй-оф сталічнае „Дынама" ўпэўнена з сухім лікам 3:0 адолела „Рыгу-2000" (зазначым, што латышскі клуб выступаў рэзервовым складам, таму што адначасна паспяхова змагаўся за тытул чэмпіёна сваёй краіны з ліепайскім „Металургам"), а „Юнацтва" ў больш напружаным змаганні ўзяло верх над магілёўскім „Хімвалакном" з агульным балансам 3:1. Мінскае „Дынама", якое трэніруе славацкі спецыяліст Любамір Покавіч, самая дасведчаная каманда ў Беларусі. У яе складзе ў гэтым чэмпіянаце выступалі такія ветэраны беларускага хакея, як галкіперы Леанід Фацікаў, Сяргей Шабанаў, абаронцы Алег Хмыль, Алег Мікульчык, форварды Андрэй Скабелка, Алег Антоненка, Віталь Валуй, Аляксандр Гальчанюк, а таксама „зборнікі" розных падбораў Аляксандр Журык, Сяргей Задзялёнаў, Аляксандр Макрыцкі, Дзмітрый Дудзік. Аднак, у фінальнай серыі належнага супраціву сапернікам „Дынама" наладзіць не здолела, што ў значнай ступені расчаравала прыхільнікаў інтрыгі. Падначаленыя Міхаіла Захарава выглядалі куды мацней і пераканаўча завяршылі справу за чатыры паядынкі (5:2, 5:0, 5:2, 8:3). Гэта ўжо трэці чэмпіёнскі тытул каманды Захарава. Сёлета „Юнацтва" сапраўды адпавядала сваёй назве — у клубе сабраныя пераважна маладыя хакеісты, якіх удала дапоўнілі некалькі аксакалаў — Уладзімір Копаць, Сяргей Еркавіч, Алег Лявонцеў, Сяргей Шыткоўскі, а таксама адзін з лідэраў нацыянальнай дружыны Міхаіл Грабоўскі. Хоць істотныя змены ў складах фіналістаў коштам вызваліўшыхся з іншых турніраў хакеістаў — справа больш чым спрэчная. Дадамо, што ў серыі за трэцяе месца рыжане перамаглі магілёўцаў з агульным лікам 2:0 (1:0, 4:2).

Баскетбольны чэмпіянат без фінальнай серыі плэй-оф усё роўна, што вяселле без нявесты. Паводле рэгламенту нацыянальнага першынства, калі адрыў лідэра ад каманды на другім месцы складаў больш трох перамог, суперфінал адмяняўся. Менавіта так і здарылася. У апошнім туры сталічны „Віталюр" двойчы адолеў прэтэндэнта на тытул „Гродна-93" і датэрмінова завяршыў справу. Гэта ўжо другі чэмпіёнскі тытул мінскай каманды, якая фактычна з'яўляецца ўласнасцю прадпрымальніка Аляксандра Яцука. Клуб вёў да поспеху Міхаіл Фейман (на суб'ектыўны погляд аўтара лепшы трэнер краіны), але незадоўга да чэмпіянату ён атрымаў адстаўку і золата „праштампаваў" ужо Аляксандр Барысаў, які раней неаднаразова дасягаў поспеху з „Гродна-93". Што датычыць срэбных прызёраў, то можа хоць цяпер гродзенцы адмовяцца ад заганнай практыкі запрашэння гульцоў збоку на паўгода-год. Падаў у адстаўку галоўны трэнер „дзевяноста трэціх" Аляксандр Папкоў, які пратрымаўся толькі сезон, адразу пакінулі клуб „часовыя" баскетбалісты.

Не спраўдзіліся ружовыя надзеі беларускіх аматараў тэніса. У чвэрцьфінальным матчы Кубка Дэвіса з Аўстраліяй Максім Мірны і Уладзімір Ваўчкоў стараліся як маглі, але гаспадары корта папросту былі мацнейшымі. Бяда айчыннага тэніса ў тым, што за дзесяць год за плячыма „Звера" і „Владыятара" так ніхто і не вырас. А бясконца цягнуць каманду Мірны і Ваўчкоў не могуць. Аўстралійцы рацыянальна размеркавалі сілы і перамаглі 5-0.

Уладзімір Хільмановіч

Сачыненне

Бяда на гэты раз здрадзіла сваёй даўняй подленькай звычцы падкрадвацца ззаду, акурат тады, калі яе ніхто не чакае, і прыйшла дакладна ў чаканы час. Як толькі адпаведныя грамадзянскія структуры абвесцілі прэзідэнцкія выбары, адразу ж адпаведныя сілавыя структуры паспяшаліся заявіць, што з боку беларускай апазіцыі, якую нібыта падтрымлівае ўвесь гэты „паганы" цывілізаваны свет, рыхтуецца антыканстытуцыйны пераварот. І што ўсе замешаныя ў ім будуць выкрыты і жорстка пакараны. Маўляў, спуску не будзе нікому. Унутраны вораг будзе разгромлены, знешні асаромлены, а нейкі там яшчэ страшны, невядомы нікому вораг пракляне той дзень, калі нарадзіўся. Кажучы карацей, у гэты дзень беларускае тэлебачанне толькі тым і займалася, што палохала суайчыннікаў.

— Хай лепш напалохаюць вожыка голым азадкам, — сплюнуўшы ад злосці на падлогу, выключыў тэлевізар Вітаўт. — Буду ведаць, дзе што робіцца, пасунуся туды. Ніколі не цікавіўся палітыкай, але зараз пайду шукаць апазіцыю. Абрыдла ўжо вось так жыць, як жывёла ў заапарку, ды ўсяго баяцца. Баяцца нешта сказаць, бо з работы папруць, баяцца на мітынг выйсці, бо міліцыя забярэ, баяцца...

— Страх — найлепшая страхоўка, — не пагадзіўся з ім яго сусед Валянцін, у якога Вітаўт быў гэтым разам у гасцях. — І добра, што мы нікуды не лезем. Палезлі б, то ўжо сто разоў атрымалі б па рагах і паміж рагоў. Працу згубілі б. А дзяцей карміць трэба. Хто, акрамя нас, імі заапякуецца?

— У тых, хто змагаецца, таксама дзеці ёсць. І маюць яны праблемы толькі таму, што такія як мы ўсяго баімся і іх не падтрымліваем, — не здаваўся Вітаўт. — Былі б з імі разам, даўно годнае жыццё для сваіх дзяцей забяспечылі б. А так, і ў тых сілаў мала, і мы годнасць губляем.

— І нічога мы не губляем, — стаяў на сваім Валянцін. — Жывём мы сумленна, гадуем дзяцей. Ці ж гэта не ганаровае жыццё? Ды каб мы пайшлі зараз у апазіцыю, то каму стала б лепш? Нічога гэта не змяніла б. Толькі нашкодзіла б. І нам, і нашым дзецям. Яны зараз добра вучацца ў школе, выдатнікі. Настаўнікі іх любяць. А як мы ўляпаліся б, то і ім нашкодзілі б. Хай ідзе, як ідзе.

— Так ісці не можа вечна. Гэтая сістэма і да нашых дзяцей дабярэцца...

Не паспеў Вітаўт абгрунтаваць свае высновы, як дзверы кватэры адчыніліся і ў хату заляцелі іх сыны.

— Як там у школе? — у адзін голас запыталіся бацькі.

— Сачыненне загадалі напісаць у хаце, — гэтак жа ў адзін голас адказалі дзеці. — І казалі пісаць разам з бацькамі.

— А што за тэма?

— Тэма, як сказала наша настаўніца, вельмі простая. Пра нашую любімую Беларусь. Пра тое, як яна расквітнела за апошнія гады і за што мы любім нашае кіраўніцтва. Сказала, што тэма вельмі важная і будзе ўплываць на ўсе адзнакі. Сачыненні будуць пасылаць аж у Міністэрства адукацыі.

Бацькі перазірнуліся.

— Вось бачыш, — выдыхнуў Вітаўт. — Што я табе казаў. За дзіцячыя душы ўжо ўзяліся. Я цярпець не буду. Хочуць каб з бацькамі пісалі. Ну то я напішу. І пра тое, як я іх ненавіджу, і пра іх урад, і пра выбары. Усю праўду напішу.

— Ты што? — спалохаўся Валянцін. — Ты чуў? Гэтыя сачыненні на ўсе адзнакі будуць уплываць. Іх жа ў міністэрства адпраўляюць. Лепш напісаць штосьць нейтральнае. Што Беларусь любім за азёры, за лясы і балоты... І ілгаць не трэба, і адзнаку кепскую не паставяць. За такое, як ты хочаш напісаць, не толькі цябе з працы папруць, але і настаўніцу. Не хочаш думаць пра дзяцей, пра чужога чалавека падумай. Ты не маеш права яе падстаўляць. Гэта і ёсць гонар.

— Пішы пра што хочаш, а я напішу тое, што я лічу правільным. Хопіць маўчаць, — абурыўся Вітаўт, хапіў за руку сына і пайшоў да сябе.

Праз тыдзень сын Валянціна вярнуўся дахаты апусціўшы галаву. Адзнака за сачыненне была ніжэй сярэдняй. Апусціўшы галаву, ён расказаў бацьку, што тэма пра лясы і азёры не стасавалася з канцэпцыяй міністэрства. Трэба было пісаць пра прэзідэнта.

— А што ж тады паставілі сыну Вітаўта? — спытаўся бацька.

— Ён атрымаў самую высокую адзнаку. Настаўніца сказала, што падзяляе погляды яго бацькі. Толькі прасіла прабачэння, што не змагла паслаць сачыненне ў міністэрства. Недзе згубіла сшытак...

Генрых Зпадашмянскі

Асаблівасці вярбы

Вярба з'яўляецца паўсюдным, але адметным дрэвам. У краявідзе адыгрывае важную экалагічную ролю. Даўней вярбовыя лозы былі сыравінай для выплятання кашоў. Вясной вярбовыя галінкі сімвалізуюць свята называнае Вербніцай.

У Польшчы расце 27 відаў вярбы, у большасці кусты і кусцікі. Адзінокія дрэвы і іх шпалеры ўтвараюць два віды вярбы: белая і ломкая ды іх гібрыды.

Вярба — з выгляду нетрывалая, спарахнелая і знявечаная — з'яўляецца сімвалам жывучасці. Падтопліваныя навесну, абрэзваныя людзьмі, абпальваныя агнём, патрэсканыя і паламаныя ад старасці вербы штогадова нанова пакрываюцца найперш пупышкамі а затым зеленню. Растуць паўсюдна, бо лёгка размнажаюцца самасейна, а хопіць вярбовую ветку ўсадзіць у зямлю і яна выпусціць карані ды вырасце буйным дрэвам. Выпускаюць лісткі таксама вярбовыя жэрдкі ў платах.

Раней вербы насаджвалі выключна ва утылітарных мэтах: тоўстыя галіны зрэзвалі на апал, а веткі для выплятання кашоў. Сёння, часта бяздумна, спальваюцца і высякаюцца апошнія вербы. Людзі заворваюць межы і высякаюць растучыя на іх дрэвы. А вербы адыгрываюць важную экалагічную ролю. У сельскім краявідзе яны паслабляюць сілу ветру, папраўляюць вільготнасць глебы і прыпыняюць яе эрозію. У дуплах гэтых дрэў гняздуюць восы і шэршні ды размаітыя птушкі: сініцы, вераб'і, шпакі і нават невялікія совы. У голлі будуюць гнёзды сарокі, вароны і галубы. Межы бываюць стойлам і сталовай пералётных птушак, курапатак, фазанаў і зайцоў. Вербы і межы з'яўляюцца сховішчам ласак, гарнастаяў, тхароў і куніц, якія ў асяроддзі палёў і лугоў харчуюцца галоўным чынам палявымі грызунамі. Кожнае сямейства соў, якія гняздуюць у вербах, з'ядае звыш дзесяці тысяч палявых грызуноў у год. Вясковыя краявіды, пазбаўленыя дрэў, не маюць і начных саюзнікаў земляробаў. Дзеля гэтага трэба пакідаць вербы ў якасці важнага суб'екта нашых краявідаў там, дзе ім найлепш і поруч з імі лепш людзям і звярыне.

* * *

Без вярбовых лозаў цяжка ўявіць Вялікдзень. 16 красавіка пачынаецца Вялікі тыдзень, апошні тыдзень велікоднага посту. У перадвелікодную нядзелю, якую ў народзе называюць Вербніцай, адзначаем Уваход Гасподні ў Іерусалім і ў памяць гэтай падзеі ў час набажэнства асвячаюцца вярбовыя галінкі, пальмы.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Асвячоныя вярбовыя галінкі людзі трымалі за іконамі, а з надыходам зімы або чарговага Вялікадня іх спальвалі; асвячоных прадметаў нельга выкідаць на сметнік. Яшчэ раней іх пускалі з цячэннем ракі. На жаль, сёння, асабліва ў гарадах, пальмы з засушаных — часта штучных з пафарбаванымі сцяблінкамі — кветак купленыя на базары, пасля нейкага часу, калі пыл прыхавае іх прыгажосць, вандруюць у сметнік.

Традыцыя асвячоным вярбовым галінкам прыдавала магічныя ўласцівасці. Распушчаныя іх пупышкі лічыліся сімваламі пладавітасці, сілы, маладосці. Людзі сцябаліся ўзаемна галінкамі, прыгаворваючы: „Вэрба б'е, нэ заб'е, за тыждэнь Вэлікдэнь..." ды жадалі сабе поспехаў і багацця. Каўталі таксама пупышкі, якія мелі прадухіляць боль і хваробы дыхальных шляхоў і лёгкіх. Асвячоныя галінкі прымяняліся для замовы ад навальніцы, абкурвалі імі жанчын у час родаў і хворую жывёлу. Людзі верылі, што яны ахоўваюць ад маланкі, пажару і іншай небяспекі. У Велікодны панядзелак асвячалі імі палі. Калі вясною ўпершыню выганялі быдла на пашу, сцябалі яго пальмай каб не хварэла ўлетку. Ва ўсіх гэтых звычаях азываецца рэха старажытных, яшчэ дахрысціянскіх забабонаў.

Міхал Мінцэвіч

На бацькоўшчыне цішыня...

Я люблю падарожнічаць па дарогах, ля якіх менш сустракаюцца пасяленні, дзе насустрач не свішчуць аўтамабілі, раскідваючы перадвясновы снег, цешыцца хараством зямлі. Знаёмыя, рассеўшыся на заднім сядзенні аўтамабіля, прыціхлі. Ім таксама абрыд горад, штодзённая ў ім мітусня людзей, хмарачосы падзеленыя на шпакоўні, у якіх жывуць малашчаслівыя людзі... У вачах маіх спадарожнікаў расшырыліся зрэнкі, калі далей ад дарогі ўбачылі статак курапатак і пасвіўшыхся на азіміне сарнаў. Перад Вулькай-Выганоўскай, над рачулкай, апусціўшы галаву, стаяла старая кабыла, углядаючыся ў ваду. Перад паваротам дарогі ўлева, у сядзібе спадара Мацієвіча, пад паветкай быццам, драмала карова, а той экзатычны чалавек таксама трываў у дрэме над палонкай, лавіўшы рыбу. Можа, тая карова нудзіла па цяляці, забітым і завезеным у горад на спажыву нашчадкам тутэйшага земляроба. Гляджу на маіх усміхаючыхся спадарожнікаў, радых паездцы на ўлонне прыроды. Дарога вузкая, пралягае пасярод маладых пралескаў, дзе раней людзі сеялі збожжа. Наша сяброўка, якую мы ўзялі палюбавацца нашымі краявідамі, уздрамнула і ніяк яе не можам разбудзіць; сон мілейшы за ўсё на свеце...

Лічыльнік аўтамабіля паказвае нам толькі 40 км ад Гайнаўкі. А вось мы і даехалі ў Чахі-Забалотныя. Загіб вуліцы, з левага боку стаіць родная хаціна. Мікола разам з сябрамі расстаўляюць тэлекамеры, рыхтуюць мікрафон; пачынаю даваць інтэрв'ю — аб маладосці, пісанні першых апавяданняў, агрэсіі сялян на праўду ў літаратурным творы, жаніцьбе і выездзе ў Гайнаўку. Да нас падыходзіць вясковец і, папыхваючы папяросай, пачынае сяброўскую гутарку:

— Вось тут маем чыстае паветра, цішыню...

— Гэта праўда, — кажу я. — Лёгка тут дыхаць, не тое што ў горадзе. Ды якая розніца курцу — чыстае паветра наўкола, ці не?..

Праз галінастыя вязы прадзіраецца сонейка, бель снегу прымушае нас жмурыць вочы. На вуліцы паказалася старэнькая жанчына, з кіёчкам, вяртаецца ад суседкі дадому. Цішыня... Чуваць, як скрыпіць пад нагамі абледзянелы снег, як стукаюць кроплі з даху асірацелай, без жыльцоў хаты. Вокны заслоненыя, замок на дзвярах. На ўсходках ляжыць неварушаны снег. Мабыць, у хаце жывуць адно мышы. Недалёка стаіць клуня крытая саламянай страхой, стрымяць голыя латы, быццам буйвалавы рэбры на афрыканскай саванне! Хто будаваў гэты дом і стадолу? Калісьці кіпела тут жыццё, цяпер тыя будыніны ціха стаяць і нішчэюць.

Мікола паглядзеў хвілю на хату-сірату, уздыхнуў і сказаў быццам бы да сябе толькі:

— Гэтак бывае і з намі, людзьмі?..

Вадзіцель схаваў тэлекамеру, мы хуценька ўселіся на свае месцы, праехаліся праз сяло, павярнулі назад у дарогу дамоў. Яшчэ раз затрымаліся, у маладым хвайняку, каб падыхаць свежым паветрам, нацешыцца казачнай цішынёю. Паблізу дарогі нечакана сталі сакатаць цецерукі, даючы знак аб надыходзячай вясне. За няпоўную гадзіну даехалі мы ў Гайнаўку. Гарадская мітусня ахутвала і ўцягвала, быццам пылацмок у штодзённае жыццё. У гарадах людзі, хаця не ўсе, жывуць у дастатку, аднаго не хапае — цішыні. Яе трэба шукаць далёка за горадам.

Сцяпан Карбоўскі

Не дагонім

Так сказаў мне адзін з нашых вяскоўцаў, які ў часе нямецкай акупацыі быў на прымусовых работах у Германіі (пра гэта быў у „Ніве" мой допіс). Я яму прыгадаў, што адзін з такіх жа зняволеных, Аляксандр К. (нядаўна трагічна памёр) гаварыў мне, што мы сёння матэрыяльна дагналі колішнюю Нямеччыну, бо ў той вёсцы, дзе ён працаваў, было толькі тры трактары, а сёння ў Польшчы, так як у Дубічах-Царкоўных, кожны гаспадар мае свой трактар, а некаторыя маюць нават па некалькі такіх машын. Мой суразмоўца згадзіўся са мною, але толькі ў тым, што менавіта ў колькасці трактароў, бо далей астаемся ззаду па плёнах з гектара, парадку ў вытворчасці, павагі да земляроба і ў яшчэ іншых аспектах. Ды, дадаў ён, якія ў нас гаспадары, хаця б у Дубічах? Амаль усе пенсіянеры і які толк з такога гаспадарання?..

І гэта праўда, бо ў нас ёсць такія, якім пераваліла ўжо за восемдзесят, а гаспадараць яны, быццам ім было па дваццаць гадоў. Напэўна ў Польшчы ёсць сапраўдныя гаспадары, якія не горшыя ад колішніх і цяперашніх немцаў і менавіта на такіх разлічвае ўрад у Варшаве. Мой суразмоўца яшчэ зазначыў, што каб падняць гаспадарку патрэбныя грошы, бо калі іх няма, тады трэба звяртацца ў банк за крэдытам, а працэнты ад таго крэдыту могуць і зусім праглынуць даўжніка. Калі будавацца, тады трэба разлічваць толькі на сябе, бо няма фірмаў, якія б гэта зрабілі сумленна, як было ў немцаў. У нас прывязі матэрыял загадзя на будову, дык яго расцягнуць, а нават патрапяць з незакончанага будынка павыдзіраць вокны разам з абрамленнямі; хіба помнім, што нават гайнаўскі танк нейкія жулікі сумелі ўкрасці і вывезці. У немцаў такога не было, бо зладзейства лічылася вялікай ганьбай, і хіба нават сёння няма, хаця свет змяняецца.

Мікалай Панфілюк

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Віншаванне

У беларускага чытача — свята! Пяцьдзесят гадоў — газеце „Ніва"!

Памыляецца той, хто лічыць, што „Ніву" — тыднёвік беларусаў Польшчы — чытаюць толькі дома. Ведаюць і паважаюць беластоцкую газету і ў нас, у Латвіі. Амаль год латвійскія беларусы маглі чытаць гэтае перыядычнае выданне, якое распаўсюджвалася праз Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак", і знаёміцца з жыццём беларусаў у суседняй дзяржаве. Не губляем сувязі і цяпер, чытаем „Ніву" ў Інтэрнэце.

Паўстагоддзя беластоцкія журналісты асвятляюць падзеі жыцця беларускай меншасці суседняй з намі краіны Еўрасаюза, расказваюць пра самыя значныя падзеі на Беларусі. Але, як падаецца, самае адметнае, што робіць „Ніва" — гэта тое, што газета дапамагае беларусам жыць, усведамляць і атаясамліваць сябе менавіта беларусамі. І не толькі ў Польшчы. Пытанні асіміляцыі актуальныя і для латвійскіх беларусаў, у прыватнасці той часткі беларускага насельніцтва, якая пражывае ў Латгаліі. І як тут не прыгадаць адно з інтэрв'ю, прысвечанае беларусам Польшчы. На пытанне, што прымушае іх не „апалячыцца", а заставацца беларусамі, адказ быў кароткі і просты: „Толькі гонар!" І гэтага гонару, чалавечай і журналісцкай годнасці журналістам „Нівы" не пазычаць!

Пяцьдзесят гадоў беларускай газеце, якая выдаецца па-за межамі Беларусі, гэта, канешне, падзея! І мы ад усяго сэрца віншуем і чытачоў, і рэдакцыю газеты з гэтай датай. Асабліва цёплыя словы выказваем у адрас беластоцкіх журналістаў. Мы ведаем, што ў Вас зараз нялёгкія часы. Вядома, прыкра, што сваё свята Вы вымушаны адзначаць у перапынках паміж судовымі пасяджэннямі. Але мы — сябры газеты, а яны ў беларускага штотыднёвіка — ва ўсім свеце, не губляем веры, што „Ніва" выстаіць і пераможа, і мы зноў сустрэнемся на яе старонках.

Творчага плёну, шчасця, здароўя — яшчэ на паўстагоддзя!

Латвійскае таварыства беларускай культуры „Сьвітанак"

З Юбілеем!

Я шчаслівы — паўвека з „Нівай"

Супрацоўнікам і чытачам „Нівы"

Задаволены я і шчаслівы,
Мой творчы лёс спалучыўся з „Нівай"
Я надта цешуся — адбыўся тут
Літаратурны мой дэбют.
А радасцяй маёй найпершай —
Змясціў дзве тысячы з паловай вершаў.
Быў тут я штатным і няштатным,
Заўжды са шчырым словам братнім.
Папраўдзе ў „Ніве" менавіта
Майго ўсяго жыцця адбітак.
Мае артыкулы і лірыку, сатыру
Пісаў заўсёды сваім сэрцам, шчыра.
І пастаянна ў „Ніве", аж да стомы
Пытаўся чытачоў шматлікіх: хто мы?
Адказваў надта шчыра, што клянуся,
Былі мы, ёсць і будзем беларусамі!
І сэрца чулае сціскалася ад жалю,
Калі нас, быццам верныя, пакідалі.
І цешуся, што яшчэ нас многа
Гатовых да далейшае дарогі
Ідэй святлейшых, вернага змагання
За меншаснае наша існаванне.
Я пажылы ўжо, і таму нашчадкам
Жадаю „Ніву" бараніць як матку.
Каб асталіся вернымі народу,
Каб „Ніва" каласілася заўсёды.

Віктар Швед, Беласток, 4.03.2006 г.

„Ніве" — 50

Заява Сакратарыята ГА „ТБМ імя Ф. Скарыны"

4 сакавіка адзіная беларускамоўная газета Польшчы „Ніва" адзначыць свой юбілей. Заснаваная ў 1956 годзе ў Беластоку, у цэнтры тэрыторыі, якую спрадвеку насялялі беларусы, газета стала іх дарадцам і выразнікам, спрыяла захаванню беларускай мовы і культуры ў пасляваеннай Польшчы. Вакол яе згуртаваліся мясцовыя пісьменнікі, навукоўцы, журналісты, настаўнікі і краязнаўцы, якія здолелі захаваць беларускую прысутнасць у польскай дзяржаве, насуперак неспрыяльнаму стаўленню да беларушчыны ў суседняй БССР, дзе апантана будавалі савецкі рускамоўны камунізм.

Дзякуючы таму, што „Ніву" можна было выпісаць і нават набыць у СССР, газета спрыяла захаванню беларушчыны на савецкіх абшарах, асабліва ў „застойны" брэжнеўскі час.

Калектыву рэдакцыі хапіла моцы захаваць газету і ў часы пабудовы новай, посткамуністычнай Польшчы, якая цяпер ёсць часткай аб'яднанай Еўропы. Часам хто-ніхто не падзяляў пазіцыю газеты і пачынаў хвалю супраціву. Пераслед газеты не спыняецца і зараз, бо нікому не патрэбна стабільная праява беларушчыны нават у часы дэмакратыі і плюралізму.

ТБМ рашуча выступае супраць судовага пераследу рэдакцыі і рэдакцыйнай рады „Нівы" і жадае калектыву поспеху ў нялёгкай справе выдання беларускамоўнай газеты і яе распаўсюдзе. Хай жыве і квітнее беларускае слова на старонках „Нівы" ды іншых выданняў беларусаў Польшчы.

Прынята на Сакратарыяце ТБМ 22 лютага 2006 г.



Адгаданка

1. ствол агнястрэльнай зброі, 2. італьянскі горад, якім з 697 да 1797 года правілі дожы, 3. участак зямлі для вырошчвання агародніны, 4. напр. Арлянка, Нараўка, Нурэц, 5. каштоўная паявая папера або мэтанапраўленае дзеянне, 6. частка адзення, якая прылягае да шыі, 7. Барыс, аўтар кнігі „Сняцца сны аб Беларусі" (1936-1995), 8. маленькі крывасмок, які ў беларускім фальклоры зваліўся з дуба, 9. лекар, 10. гульня заснаваная на падліку цотных і няцотных ачкоў, 11. яшчэ не юнак, 12. элементарная часцінка ў складзе атамнага ядра з дадатнім зарадам. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — застольнае выслоўе.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 10 нумара

Кракаў, эмір, азон, гарэм, муж, лыка, Ева, акно, Шапэн, табу, недагляд, дым, Купала, воласць.

Рашэнне: **Калі розуму ў галаве мала, дык шапка не дасць.** Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

„Даўціпы"

Андрэя Гаўрылюка

— Пан доктар, ці ад плавання можна пахудзець?

— Ці я ведаю? Хіба не...

— Чаму?

— А ці бачылі вы калі кіта?

* * *

Муж вярнуўся ноччу зусім п'яны. Жонка папракае яго, што абяцаў кінуць піць...

— Гэта мой спосаб каб адвыкнуць ад гарэлкі, — балбоча муж.

— Дзіўны гэта спосаб...

— Бо калі больш п'ю, тады мне больш трасуцца рукі. А калі больш трасуцца рукі, тады разліваю больш гарэлкі. А калі больш разліваю, тады менш выпіваю.

* * *

Між сяброў:

— Чаму ты такі сумны?

— Ніхто мяне не любіць.

— Гэта няпраўда: ёсць шмат людзей, якія цябе не ведаюць.

16.04 – 22.04

Баран (21.03. — 19.04.) 16-20.04. пагражаюць табе непаразуменні на працы ці ў школе, сваркі, сямейныя непаладкі. Здымі нагу з педалі газу, кіруючы аўто. Замест сварыцца, вазьміся за рамонт або за справы, з якімі іншыя не ў змозе справіцца.

Бык (20.04. — 20.05.) 16-20.04. устрымайся ад вырашання важных спраў, нават малая праблема можа цябе вывесці з нерваў. 18-22.04. фантастычны настрой і фантастычная фізічная форма. Знакаміты час не толькі на забаву, але і важныя вырашэнні.

Блізняты (21.05. — 21.06.) З 21.04. — знакамітае пачуццё гумару, што прыдасца на працы. Пачуцці паміж вамі могуць разгарэцца з яшчэ большай сілай; кіпенне пачуццяў можа давесці да выбуху, а вельмі блізка ад кахання да нянавісці!

Рак (22.06. — 22.07.) Парвеш з апатыяй, самашкадобай, кепскім настроем. Марс дадасць рашучасці і вялікага тэмпераменту. Пагаворыш па-мужчынску з тымі, хто табе залез пад скуру!

Леў (23.07. — 22.08.) Да 18.04. ёсць у табе нават лішак энергіі, зможаш перамагчы ўсе перашкоды. Прадпрымальнасць і ахвота падзейнічаць. Пільнуй дэталяў! У твае справы можа захацець умакнуць свае пальцы сям'я.

Дзева (23.08. — 22.09.) Дасканалы час для фінансавых і прафесійных праектаў. Упартасць і мэтанакіраванасць прынясуць відныя вынікі.

Шалі (23.09. — 22.10.) 18-22.04. можаш спадзявацца агромнага поспеху ў фінансах і прафесійных справах. Выплывеш на шырокія воды. Часцейшыя кантакты з сябрамі.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Добры час сесці на ачышчальную дыету. Могуць цябе павысіць на працы, можаш пытацца пра дабаўку ў шэфа. Работа таксама зваліцца табе на спіну, можа цябе вышлюць у камандзіроўку. Раптоўныя захапленні чыёйсьці красой і духоўнасцю.

Стралец (22.11. — 21.12.) Ідылія ў пары (асабліва 18-22.04.). Лёгка прыкмеціш плюсы кожнай сітуацыі і зможаш іх выкарыстаць. З кіраўніцтвам жыві як найлепш, але не прабуй падмазвацца (не спадабаецца гэта калегам, а і шэф гляне з падазрэннем).

Казярог (22.12. — 19.01.) Спрыянне старэйшых асоб і прыхільнасць кіраўніцтва. Добры час на працу патрабуючую пільнасці, цярплівасці і дакладнасці.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Можаш пазнаёміцца з чалавекам, які зачаруе цябе красой, ветлівасцю, інтэлігентнасцю. Будзь спантанны і паддайся планам, якія рыхтуе табе лёс. Бліжэйшыя сувязі з бацькам ці дзедам; будуць табой ганарыцца.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Жыццё плыве спакойнай плынню. Кіруйся да мэты дробнымі крокамі. Меркурый і Сонца падтрымліваюць тваю спраўнасць і кемлівасць. Можаш пашукаць сабе добрага супольніка на падмогу ў занятку; спатрэбіцца ён і пазней. Падабаешся.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960

Люба Салінская ☞ III

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

Яцэвічы ☞ IV

Блукаўся па цалюткім свеце

Успаміны Аляксандра МУСЬКО з Дубна, народжанага ў 1922 годзе.

У школе

У школу хадзіў я ў Нурэц, восем гадоў. Спярша было ў ёй чатыры класы, пасля зрабілі яшчэ пяты, а далей вучыцца трэба было хадзіць у Боцькі. А туды не ўсе хадзілі і я не пайшоў.

У Нурцы вучылі прыезджыя настаўнікі, недзе з Захаду. Загадчыкам быў Аляксандр Казіцкі і вучыла яшчэ адна настаўніца, з якою загадчык пасля ажаніўся. Загадчык меў матацыкл „BMW", які трымаў на ганку і прасіў, бывала, мяне, каб дапамагчы той матацыкл выводзіць, бо цяжкі быў. Перад 1939 годам настаўніцкае сужонства перавялі ў Гайнаўку, а ў Нурэц далі двух іншых настаўнікаў, якія вучылі да прыходу немцаў. Як насталі ў 1941 годзе немцы, тады забралі тых настаўнікаў і вывезлі пад Пятроўшчыну, што каля Грузкі, і там іх расстралялі. Гаварылі, што ў 1939 годзе пад Бельскам збілі нямецкі самалёт, з якога пілот на парашуце саскочыў. У тое месца пазбягаліся людзі, у тым ліку і адзін з тых настаўнікаў туды трапіў, рабіў таму пілоту здымкі, брыдкасловячы яму. Немец яго запамятаў, пасля выследзіў і так адпомсціў. Хадзілі чуткі, што нядаўна тых настаўнікаў эксгумавалі ў выніку хадайніцтваў сямейнікаў аднаго з іх і перапахавалі на іх радзіму.

Пасля школы я працаваў з бацькамі на гаспадарцы. У верасні 1939 года ў канцы нашай вёскі з боку Нурца мясцовыя актывісты пабудавалі прывітальную браму саветам. Але рускіх тут амаль не было, бо яны пайшлі галоўнымі дарогамі.

У шахты

Хлопцы, з якімі я сябраваў, паехалі ў Бельск і запісаліся ў шахты ў Казахстан. Вярнуліся яны з Бельска і намовілі мяне. Я паслухаў іх, але мяне не хацелі запісаць, бо не меў яшчэ васемнаццаці гадоў. Тады мы звярнуліся да Барташука, нашага актывіста, і ён даў спраўку, што мне ўжо васемнаццаць; пасля гэтага мяне запісалі ў Казахстан.

Пасля трох-чатырох тыдняў паклікалі нас у Бельск, дзе мо з два тыдні трымалі ў жыдоўскай бажніцы, дзе быў зборны пункт. Калі скамплектавалі ўсіх, тады падставілі транспарт і адправілі ў Караганду. Ехалі месяц у таварных вагонах з печкай. У Слоніме транспарт затрымаўся, гаварылі, што пастаіць даўжэй. Мы падаліся ў горад, а калі вярнуліся, эшалон ужо ад'ехаў. Мы тады селі ў пасажырскі поезд і дагналі наш транспарт у Баранавічах. Знайшлі свой эшалон, які там прастаяў некалькі сутак.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

А. Мусько: Вайна засцігла і маіх сяброў, што асталіся ў Мінску. Сагналі іх у лагер і знаёмыя паненкі ім ежу прыносілі. А калі іх распусцілі, то дахаты пяшком вярталіся. Усе хлопцы з Дубна вярнуліся...

Сядзімо каля печкі, уступае да нас маёр. А я да прыходу саветаў быў пажарнікам, меў пажарніцкую форму з пагонамі і ў ёй выбраўся ў дарогу. Той маёр, як мяне ўбачыў у такой форме, адразу кінуўся на мяне:

— Ты фашыст!

І хацеў мяне арыштаваць. Аднак мае сябры растлумачылі яму ў чым тут справа і ён адступіўся. Загадаў толькі адрэзаць польскія пагоны.

Харчаваліся мы тым, што з хат забралі: хто саланінай, хто чым. Можна было купляць ежу і на вакзалах. На станцыях была пераварана вада і мы яе набіралі. З Бельска наш транспарт выехаў у пачатку лютага, ехаў месяц і ў пачатку сакавіка заехаў у Казахстан. Пачынаў раставаць снег.

У капальні

Караганда ў той час будавалася і нам далі памяшканне ў жылым блоку. Нас, шасцярых з Дубна, пасялілі ў адной кватэры; пазней дадалі нам яшчэ аднаго хлопца з Мельніка. Кватэра была вельмі добрая, з цэнтральным абагрэвам і прыбіральняй. Пасцель была такая белая, што некаторыя баяліся ў ёй спаць. Парадкі наводзіла прыбіральшчыца.

Спярша нас падвучвалі, па шахтах вадзілі, усё паказвалі, вадзілі нават у кіно. А пасля далі каскі, працоўныя прылады, спецвопратку. Працавалі нейкіх сто метраў пад зямлёй, з'язджалі туды ліфтам. Кожны меў лапату, кірку, сякеру. Урубная машына з двухметравым языком падрэзвала скалу знізу. Вярцільшчыкі свідравалі скалу свідрамі. Закладалі туды дынаміт, залеплівалі яго глінай. Пасля з апарата, злучанага тонкім дротам з дынамітам, запальвалі ўзрыўчатку. А мы лягалі ў нізкае месца, каб не атруціцца метанам, які ў той час паяўляўся ў верхніх слаях паветра. Калі ўсё абсела, мы шуфелямі і кіркамі раўнялі прорву. Вугаль адвозілі вагончыкамі або транспарцёрам з электрарухавіком да ліфта.

Працавалі, бадай, па восем гадзін у суткі. У нашай капальні ніхто не згінуў, хаця завалы былі. Але калі нават і былі ахвяры, дык тады ж пра такое весткі не распаўсюджваліся.

Спяшра елі мы ў сталоўцы, але там настаў крызіс, стала цяжка. Нават забаставалі, не пайшлі на працу. Тады прыехалі да нас актывісты, разведалі сітуацыю, знайшлі віноўных: былі гэта браты Супнеўскія з Галадоў, іх забралі і яны ўжо дадому не вярнуліся.

Пасля гэтага нам наладзілі сталовую ў нашым жылым блоку, пакоік з кухняй. Ніна, жонка энкавэдзіста, нам правіянт прыносіла: хлеб, катлеты. А з хлебам было там туга, трэба было сярод ночы ў чаргу ставаць і не ўсім хапала. А Ніна пра нас дбала, нават калі грошай не мелі, тады дастаўляла нам ежу напавер. Не заўсёды атрымлівалі зарплату на час, бо і капальня грошай не мела.

Асабліва цяжка было зімою, калі два-тры тыдні запар дулі завірухі; тады нават тунелі для паяздоў капалі. Ад нашага жылля да шахты было восем кіламетраў і нам гэты прамежак трэба было штосутачна адольваць. І як задувала, тады не вярталіся ў кватэру, толькі на шахтах начавалі, спалі на падаконніках, на радыятарах. У буфеце куплялі кіслае малако і булкі і зноў да работы; так працягвалася і па некалькі сутак. Або наадварот было: па некалькі дзён не хадзілі на шахту, але гэтага не лічылі нам прагулам. Быў там Грыша з Орлі, ён не пайшоў на працу і яго падалі ў суд за прагул. І як пайшоў ён у суд, то ўжо ў Орлю не вярнуўся.

Вяртанне з шахтаў

Ад 7 сакавіка да 25 мая 1940 года працаваў я адбоенавальшчыкам, пасля, да 1 верасня таго ж года, адкатчыкам, а далей — крапільшчыкам. Калі мінуў год працы, падаў я прашэнне да дырэктара каб звольніцца. А ён не хоча мяне звальняць, накінуўся на мяне. Але зараз змяніўся, пачаў прасіць мяне, каб я не звальняўся. Я не згадзіўся і ён мяне падае ў суд, за прагул. Знаёмы бухгалтар падказаў мне, каб я ўзяў з бюро копію працоўнай дамовы, бо я пры сабе гэтага дакумента не меў. Я ўзяў тую копію і пайшоў на суд. Там малое памяшканне, пачакальня, некалькіх падсудных. Клічуць мяне, там суддзя, кучаравы казах. Ну, думаю, хіба засудзіць. Запісаў мяне і пытае, чаму не хадзіў на працу. А я яму адказваю, што дамова ўжо скончылася, праца мне не падабаецца і хачу вярнуцца дахаты. Ён спытаў мяне пра дамову, я яму яе паказаў, ён яе ўзяў і кажа:

— Вы свободен!

Але я не давяраю, прашу каб даў мне пастанову суда.

— Обождите, — кажа.

Але мне не цярпіцца, заходжу да сакратаркі, яна мне напісала тую пастанову. Вярнуўся я на кватэру, зноў напісаў заяўку і нясу дырэктару. Ён глянуў і напісаў, каб мне

[працяг ☞ II]

Блукаўся па цалюткім свеце

[I ☞ працяг]

выдаць разлік. 8 красавіка 1941 года мяне звольнілі з шахты.

Заплацілі мне за работу. Я яшчэ пропуск захацеў праз старую граніцу, але мне яго ў НКВД не даюць, бо там не хапала рабочых. Я тады так еду ў Мінск і тут хачу пропуск атрымаць. Далі мне анкету, а я не ўмею яе запоўніць, якаясь жанчына мне яе напісала, але начальнік ужо не прыняў яе; было гэта ў суботу. Я тады падаўся да калегаў, што разам у шахце працавалі, толькі яны раней выехалі з Караганды і затрымаліся на працу ў Мінску, бо таксама не атрымалі пропускаў праз старую граніцу. У панядзелак зноў нясу анкету, начальнік запатрабаваў да яе яшчэ зрабіць у спецыяльным бюро копію працоўнай кніжкі. А ў тым бюро ўжо закон змяніўся. Адзін з маіх сяброў, што быў з Крывой, меў у Мінску дзядзьку, які працаваў дырэктарам фармацэўтычнай фабрыкі. Дзеці дырэктара напісалі мне тую копію, начальнік прыняў ад мяне дакументы і сказаў прыйсці па пропуск 30 красавіка.

Узяў я пропуск і вярнуўся да калегаў, а ў іх кантроль перад Першамаем. І да мяне прычапіліся, што не прапісаны. Я падаўся на вакзал, але хочацца той Першамай пабачыць, той парад. На вакзале я задрамаў, абудзіў мяне міліцыянер і пытае, куды я еду.

— В Ленинград, — адказваю.

Прыйшоў другі міліцыянер, узялі мяне пад рукі і завялі на ўчастак. Там праверылі мае дакументы і кажуць:

— Бери пропуск и едь домой!

А я ім свайго пропуска не паказваў. Паглядзеў я парад, пабыў яшчэ ў сяброў, вечарам сеў на трамвай, заехаў на вакзал і заняў чаргу за білетамі; быў трэці або чацвёрты. За мною з вечара да раніцы вырасла вялікая чарга. Перад восьмай гадзінай раніцы прыйшла тэлеграма, што можна прадаць пяць ці шэсць білетаў. Я білет купіў, а рэшта вялікай чаргі асталася.

Сеў я на поезд, быў са мною яшчэ сябра з Мельніка, што разам на шахтах жылі. Прыехалі ў Бельск каля другой гадзіны ночы і ідзем пяшком у Дубна. Прыйшлі на досвітку 3 мая 1941 года. Стукаю ў акно сваёй хаты, адкрывае мне савецкі афіцэр, што ў нашай хаце жыў; мае бацькі ў той час жылі ў алькеры. Бацькі нас прынялі, пасходзіліся сябры, суседзі, пагасціліся. Свайго спадарожніка я завёз у Журобічы, да ягонага брата, якога туды з Мельніка выселілі і там працаваў ён лесніком.

Казахскі пашпарт Аляксандра Мусько

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Працоўная шахцёрская кніжка

Напярэдадні вайны

А каля Дубна стаяла савецкая ваенная часць, якую сюды перакінулі з фінскага фронту. Па цэлым лесе пакапалі зямлянкі, у якіх жылі салдаты; салдатам нельга было выходзіць на вёску. Большасць афіцэраў кватаравалася па хатах; у нашай хаце жыў палітрук Пятро Чарэднічэнка, украінец. Зямлянкі былі з драўніны, вялікія. З таго боку лесу, дзе цяпер з могілак старыя вянкі скідаюць, была памыйная яма. З другога боку была сталовая і кіно; жыхароў Дубна вайскоўцы на фільмы запрашалі. Пад балотам былі склады цяжкіх і лёгкіх боепрыпасаў.

Калі ўспыхнула вайна, дык на першы дзень рускія ўзарвалі склады боепрыпасаў; яны былі далёка ад вёскі. Сышліся жыхары Дубна і да іх звярнуўся з прамовай палкоўнік; сказаў ён:

— Немец напаў. Мы адступім, але ён вайны не выйграе. Прыйдзе час, калі пачнецца трэцяя сусветная вайна і тады след следу людскога шукаць будзе.

І зараз, у нядзелю, рускія адступілі. Са складаў, якія былі ў ваенным гарадку, людзі забіралі салдацкую адзежу, куфэркі, мэблю, пасцель. Як настаў немец, тады склікалі вяскоўцаў і загадалі ўсё тое савецкае дабро прынесці ў пажарнае дэпо, і людзі шмат прынеслі. Усе зямлянкі людзі раскідалі і драўніну на апал забралі; ямы зямлянак пазарасталі пасля саснінай.

Вайна засцігла і маіх сяброў, што асталіся ў Мінску. Сагналі іх у лагер і знаёмыя паненкі ім ежу прыносілі. А калі іх распусцілі, то дахаты пяшком вярталіся. Усе хлопцы з Дубна вярнуліся.

На працу ў Германію

Немцы сталі браць маладых на працу ў Германію, паводле года нараджэння. Мяне раз вызначылі, але я заміж у Германію паехаў на тыдзень да знаёмых у Сабятына. У маю вёску прыязджалі шукаць мяне, але бацька сказаў, што не ведае, куды я падзеўся. Нямецкаму каменданту з Боцькаў патрэбная была канюшына, бацька накасіў і далі мне спакой. Пасля тыдня я вярнуўся дахаты.

Вызначылі мяне другі раз і сталі гаварыць, што калі хто не паедзе, таму хату спаляць і бацькам будуць дакучаць. У пачатку чэрвеня 1943 года падаўся я ў бельскі арбайтсамт. Установа была насупраць ратушы, па сённяшняй вуліцы Міцкевіча, у мураваным доме, які да вайны быў уласнасцю найбагацейшага бельскага жыда Бархата.

Пры санацыі Бархат да нас на лета на дачу прыязджаў, а мы ў той час у каморцы жылі. Летам усе кватэры ў Дубне займалі жыды. Мама кароў даіла, а маладыя жыдкі стаялі і чакалі свежага малака, проста ад каровы, без працэджвання, з пенай, і такое пілі. Сусед быў музыкантам, іграў жыдам. Аднойчы маладая жыдоўка кажа яму:

— Pan gra, ale nie podcina!

— Pocałuj mnie w d..., — адрэзаў ёй ён.

— Ale podciął to podciął! — ускрыкнула яна.

Так было да 1939 года.

У Прусіі

Трапіў я ў Каралевец. Сярод прымусовых рабочых былі там яшчэ Хмур з нашай вёскі і Андрэй Малец з Краснага Сяла. Працавалі ў фірме Robert Richter, якая будавала бункеры, сховішчы для абслугі лагера ад бамбёжак з самалётаў.

Спачатку жылі ў неабгароджаных бараках, побач вартоўні нямецкіх вахцёраў. Побач нас жылі савецкія палонныя. Пасля палонных вывезлі, а на іх месца перасялілі нас. Зрабілі дэзінфекцыю, але слабая яна была. Было ўсё: блохі, вошы, клапы. У нас быў парнік, у якім мы выварвалі адзежу, а праз ноч зноў было поўна вошай. Клапы са столі падалі. Зрабілі паўторную дэзінфекцыю і яна зліквідавала паразітаў.

Спярша варылі нам кармавы гарох, то яшчэ было сяк-так, голад невялікі. Пасля сталі варыць бручку і стала горш; а рабіць трэба было. Мы з Хмурам ноччу бульбу ў полі капалі і ў тазе варылі; рана ў тую бульбу цёплую каву ўлівалі і так елі. А восенню бульбу з вагонаў на таварнай станцыі Nordbahnhoff бралі. Набіраем з Хмурам бульбу ў мяшочкі. Ідзе немец, мы прыціхаем. Немец пойдзе, мы мяшочкі паскідаем, саскочым; і так ратаваліся.

Знаёмы, які жыў у квартале Ponart, дзе жылі розныя: італьянцы, французы, рускія, украінцы, працаваў на чыгуначнай пошце. Там разбівалі харчавальныя пакункі, даставалі харчовыя талоны і ён нам іх даваў, а мы маглі іх у крамах атаварыць. Раз з Хмурам пайшлі мы да яго ноччу. Даў ён нам тры харчкарты і чатыры буханкі хлеба ў сумку. Вяртаемся, запыняе нас вахцёр: Halt! Мы сталі, а ён вінтоўку знімае. Што рабіць: мы ў дзеравяках на нагах, а кругом немцы?.. Мы ходу, аж рэха пакацілася. Выбеглі на тратуар, спыніліся. Перад намі вал, а за валам трамвайны прыпынак. Мы туды! Падыходзім, а там жандар: Halt! Пасвяціў нам у твар, не тыя: Los! — можаце ісці далей. А калі б ён нас затрымаў, то шыбеніца нам была б, паказная, бо Хмур раней шэсць месяцаў у лагеры сядзеў за дрожджы. І калі *Los*, то мы ў трамвай, які пачакаў нас. Каля нашых баракаў яшчэ мінуліся з жандарамі, паспелі ў пару на працу.

Перад прыходам фронту нас перасялілі ў вагоны на станцыі. Часта былі налёты і мы сабе яму выкапалі, якую абклалі і накрылі жалезнымі шпаламі, і ў ёй хаваліся. І бомбы, якія падалі навокал, нас міналі.

У адзін сонечны дзень зенітка мо з дзесяць самалётаў збіла. А да лётчыкаў, што спускаліся з парашутаў, немцы стралялі. І калі парашут разрываўся, то пілот падаў як страла.

Знаёмы з Краснага Сяла ў час бамбёжкі быў у бункеры каля ракі Прэгель. Бомба бетон парвала і ён у Прэгель трапіў. Іншы знаёмы, з Яцэвіч, выратаваў яго.

Наступленне пачалося каля восьмай гадзіны раніцы. Пачалася перастрэлка. Немцы адступілі і ўвайшлі рускія. Было гэта 10 красавіка 1945 года.

Нас, вызваленых, было шмат, ішлі мы тлумам пад наглядам рускіх. Немцы нас абстрэльвалі, але снарады нас міналі; толькі аднаму літоўцу нагу абарвала. Калі сталі біць „Кацюшы”, тады немцы спынілі абстрэл.

[працяг ☞ III]

Чаромху зруйнавала вайна

Ваенныя дзеянні летам 1944 года, якія закончыліся вызваленнем Чаромхі-Вёскі з-пад нямецкай акупацыі, доўжыліся каля двух тыдняў. Сяло было амаль цалкавіта знішчанае ад артылерыйскіх абстрэлаў і пажараў. Перад адступленнем нямецкія салдаты падпальвалі хаты, якія ўцалелі ад абстрэлу. На 140 дамоў у Чаромсе нязнішчанымі асталося толькі каля дзесяці хатаў. Гаспадарчыя будынкі былі збудаваныя побач дамоў і таксама згарэлі ў час пажару. Загінула многа хатняй жывёлы, а ў дамах спалілася маёмасць, нажытая некалькімі пакаленнямі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Люба Салінская з болем успамінае ваенныя падзеі, пасля якіх ад большасці дамоў і хлявоў астаўся толькі попел

Доўга ішоў бой

— Рускія салдаты наступалі з-пад Дабрывады. Немцы крыху адступіліся, але давезлі ім эшалон танкаў „Тыгр". Узмоцненыя тэхнікай акупанты ізноў вярнуліся ў Чаромху і ўступілі ў бой з савецкім войскам. Нямецкія танкі, якія былі замаскіраваныя ў нашай вёсцы, знішчылі многа наступаючых рускіх танкаў. Немцы застрэлілі таксама шмат рускіх салдат. Толькі пасля абстрэлу Чаромхі савецкай артылерыяй і „Кацюшамі", немцы сталі адступацца, — кажа Ян Салінскі.

Іншыя жыхары Чаромхі пацвярджаюць версію ваенных дзеянняў, якую прадставіў спадар Салінскі.

— Спачатку рускія войскі адагналі немцаў з Чаромхі. Тады вёска была мала знішчана. У нядзелю людзі павыходзілі на вуліцу і сталі радавацца, што прайшоў фронт. Нават рускія салдаты паявіліся ў сяле і пыталіся, дзе знаходзяцца немцы, — успамінае Яўгенія Внучко. — Калі нямецкія салдаты ўехалі ў вёску на танках, пачаўся вялікі бой. Мы з мамай схаваліся тады ў яму з-пад бульбы. Пасля перабраліся мы ў сваю зямлянку і некалькі дзён чакалі, покі ішлі змаганні.

У час ваенных дзеянняў жыхары Чаромхі жылі ў зямлянках выкапаных яшчэ да прыходу савецкага войска.

— Будуючы зямлянку, мы выкапалі глыбокую яму і зверху на драўлянае рыштаванне насыпалі зямлі, — гаворыць Люба Салінская.

— Па лесе хадзілі розныя салдаты і мы апасаліся там хавацца, — дабаўляе спадар Салінскі.

— У пачатку ваенных змаганняў было так, што ў адным канцы вёскі былі яшчэ немцы, а ў другім былі ўжо рускія салдаты, — заяўляе Люба Салінская.

Мае суразмоўцы згодны, што бой у Чаромсе і яе наваколлі замарудзіўся.

— Была ў нас вялікая вайна. Амаль два тыдні ішлі баі за вызваленне вёскі. З самалётаў кідалі бомбы на станцыю. Калі ішла бамбёжка, мы хаваліся ў зямлянку. Адна з бомбаў упала непадалёк ад месца, дзе цяпер знаходзіцца абора. Яма па ёй асталася па сённяшні дзень, — успамінае Яўгенія Внучко.

Дамы загараліся ад абстрэлу

Новая хата і клуня бацькоў Яўгеніі Внучко згарэлі. Хата загарэлася ад артылерыйскага абстрэлу, а агонь на клуню перайшоў у час пазнейшага пажару.

— Калі другі раз савецкія салдаты адагналі немцаў я бачыла, як нямецкі салдат падпальваў адну з хат і як яна хутка загарэлася, — кажа Люба Салінская. — Наш дом ацалеў, але хаты і будынкі суседзяў згарэлі.

Ян Салінскі таксама бачыў як нямецкі салдат падпальваў яго хату, якая згарэла разам з усімі гаспадарчымі будынкамі. Жыхары Чаромхі баяліся выходзіць з зямлянак тушыць пажар, бо доўга ішоў абстрэл вёскі. Пасля яны апасаліся немцаў, якія падпальвалі дамы ўцалелыя ад ваенных дзеянняў. Найчасцей людзі аставаліся з маёмасцю, якую здолелі перанесці з хатаў у зямлянкі.

— Наш бацька крыху ведаў нямецкую мову і падслухаў, што немцы могуць гвалтаваць нашых жанчын. Мама ўцякла ў зямлянку суседзяў і нам бацька таксама загадаў пераходзіць з нашай зямлянкі ў іншае месца, — гаворыць Люба Салінская.

Многа коней пабілі на балотах, дзе яны пасвіліся ў час баёў. Па-

[працяг ☞ IV]

Блукаўся па свеце

На вайне

Скіравалі нас на зборны пункт, адтуль у палявы ваенкамат, у Чырвоную Армію, і на фронт. Я браў удзел у баях за Пілаў, але да горада не дайшоў.

Быў я ў акопе, калі разарваўся мінамётны снарад з карабля і мяне папаў каля ключыцы асколак; пасля мне гаварылі, што ён толькі на міліметр не дайшоў да аорты. Вочы мне закрыліся і я падумаў: лёгкая мая смерць. А калі вочы адкрыліся, тады падумаў: усё ж такі буду жыць. Але не магу варухнуцца! Пасядзеў, праз нейкі час паварушыў пальцамі. Хацеў устаць, але немцы ўзнавілі артабстрэл. Я ўзяўся за грудзі — кроў! Стала слаба. Прашу салдата, каб зрабіў мне перавязку. Ён спытаў, ці маю бінт. А я свой бінт аддаў раней раненаму сябру і не меў. Ён не хацеў мяне перавязаць, але за мною іншыя салдаты ўступіліся і перавязалі. І кажуць ісці шукаць санітарны батальён, ужо змяркала. Ехала палявая кухня на возе і я спытаў фурмана, дзе санбат.

— Сядай, — кажа мне ён, — я завязу ежу і вяртаючыся дастаўлю цябе ў санбат.

Ён завёз мяне, памог дайсці. Аказваецца — гэта не мой санбат, не хочуць прыняць, кажуць шукаць свайго.

— А куды мне ісці, — кажу, — калі не магу? Што хочаце, тое са мной рабіце.

І астаўся. Сястра зрабіла ўкол ад слупняка. Пераначаваў ноч і самаходам адвезлі мяне ў палявы шпіталь пад палаткамі, зрабілі аперацыю, а пасля самалётам даставілі ў шпіталь у Інстэрбург; быў там ад красавіка да ліпеня. Пасля шпіталь эвакуіравалі ў Растоў у Яраслаўскай вобласці.

Мая рана не зажывалася, разышліся швы. У Растове лекарка сказала, што трэба мяне аперыраваць, перашчапіць скуру, але жыўцом; сказала, што боль будзе невялікі, як пры галенні. Адна медсястра села мне на плечы, а другая на ногі, каб я не вырываўся, лекарка ўзяла дзве выразкі скуры з лыткі, перашчапіла і мая рана зажыла. Пасля ў лазні я паслізнуўся і пашкодзіў тую рану. Сястра, калі гэтае пашкоджанне пабачыла, сказала: плохо будет, але засыпала нейкім парашком і рана больш не абнаўлялася.

Вяртанне

Са шпіталя трапіў я ў аздараўленчы батальён. Там стаў прасіцца, каб адпусцілі мяне дахаты. Прасіўся да бацькоў і мой супакутнік з-пад Брэста; яму адказвалі:

— Мы тваіх бацькоў з Беларусі сюды пераселім, а цябе не пусцім, бо тут людзі патрэбныя.

Папрасілі мы лекара, ён нас скіраваў на камісію і камісія нас звольніла. 13 снежня 1945 года далі нам абходныя лісты і ў тры гадзіны пасля абеду мы ўжо былі вольныя. У сем гадзін вечара селі ў поезд у Маскву, а з Масквы прыехалі ў Брэст.

У сябраў дом зайшлі вечарам, ужо было цёмна. Нікога няма, мы селі. Прыйшла сябра жонка, ён змененым голасам пытае, ці пераначуе нас.

— Нікога не начую, — адказвае яна, — бо мужа няма.

— А дзе ён? — пытае.

— У шпіталі.

І зараз пазнала яго па голасе. Пасходзіліся суседзі, з'явілася на стол самагонка.

На другі дзень прыехаў я ў Чаромху, быў ужо вечар. Дарогі не знаю, пытаю работніка.

— Я табе не раю ісці на Снежкі, — адказвае, — бо каля Пятроўшчыны банды ходзяць, можаш не дайсці.

Але я іду, збіўся з дарогі. Пабачыў святло, падышоў бліжэй, пачуў голас у хаце, пастукаў у дзверы. Усё адразу прапала, і голас, і святло. Я да другой хаты падаўся, дзе было святло. Там дзве жанчыны пралі на калаўротку. Яны на мяне, у вайсковай форме, вочы паставілі.

— Я сам з Дубна, — кажу ім, — ці можна ў вас пераначаваць?

Паслалі мне каля печы, каб нагрэўся, бо ў старых ботах быў, у мокрых шкарпэтках. Рана мне дарогу паказалі з Дашоў, бо туды я трапіў, у Пятроўшчыну, там мой знаёмы Ваня жыў. Знайшоў яго, ён акурат бульбу са склепа даставаў. Я пачакаў пакуль ён скончыць работу і ён завёз мяне ў Снежкі, да сваякоў. Яны пагасцілі мяне да вечара, прашу, каб завезлі мяне ў Дубна. Сваяк коней запрог і завёз. Было гэта 18 снежня.

На мой прыезд сышліся людзі. Прыйшоў і Малец, які ў Дубне жыў, бо яго бацькі ў Савецкі Саюз выехалі, і той, што талоны даваў, і іншыя.

Пазней я стаў на працу ў Бельск. А ў Дубне сталі агітаваць у калгас. Найбольш намаўляў Лушчынскі з Дыдулёў, што ў камітэце працаваў; былі і іншыя актывісты, гаварылі, што гэта карысна. Частка сялян запісалася, але не ўсе. Спачатку ў калгасе добра было, а пасля пачало там псавацца. І калі ўжо можна было, тады той калгас распусцілі. Людзі забралі з калгаса, што можна было забраць: коней, садовыя дрэвы. Вось у мяне яшчэ каля хаты некалькі дрэўцаў расце, што бацька забраў.

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Нашы Яцэвічы ўцалелі

Успаміны Рыгора МІСЮКА, сына Яна, з Яцэвіч, народжанага ў 1924 годзе.

У школу хадзіў я ў Плютычы шэсць гадоў, па два гады ў кожны клас. Калі перастаў хадзіць у школу, стаў памагаць бацькам на гаспадарцы. У полі сярпамі жалі, сена на Нарве збіралі, а над рэчкай побач нашай вёскі паша была.

У 1939 годзе ў нашай вёсцы паставілі браму саветаў вітаць; амаль усе праваслаўныя сустракалі рускіх. Яцэвічы падлягалі сельсавету ў Мулявічах, сходы там ладзілі. У Страблі з маёнтку ўсіх высялілі, нават ксяндза з плябаніі; стала там савецкая часць, салдаты пастаноўкі ставілі, песні спявалі. І фільмы бясплатна ў часці паказвалі, пра буржуяў і кулакоў. Сталі набіраць на працу, разбудоўвалі чыгунку, я пайшоў працаваць у тартак у Страблі. Хто хацеў, той мог вучыцца і многія гэтым пакарысталіся.

Саветы калгас у Плютычах арганізавалі і нашу зямлю, што ў Плютычах была, таксама пад калгас забралі. Заараліі каля Плютыч усю цераспалосіцу, але як прыйшоў немец, то людзі свае ранейшыя палоскі жалі.

Немец пачаў вайну ў нядзелю, а ўжо ў панядзелак пад абед быў у нашай вёсцы. Баёў тут не было, бо савецкае войска са Страблі паўцякала; жонкі афіцэраў павыязджалі самаходамі. Пры немцах людзі, як і раней, самагонку гналі, пілі, і ўсё.

Набіралі кантынгенты для капання бульбы ў Прусіі, з Яцэвіч узялі каля дзесяці чалавек. Старэйшыя паўцякалі, а мы, малодшыя, шэсць тыдняў матычкаю бульбу капалі, пасля два тыдні буракі, а пасля ў лес вывезлі. У лесе перапрацаваў я каля двух чарговых тыдняў і захварэў; старая гаспадыня, у якой я жыў, наварыла галушак і я імі аб'еўся. Не пайшоў на працу. Прыйшоў ляснік і пытае мяне:

— Хворы?

— Хворы, — адказваю.

— Пайшлі! — кажа.

Завёў мяне ў лес і пабіў дубінкаю. Далі да нас старэйшых людзей, каб паказвалі нам, як трэба працаваць. Пасля двух тыдняў трапіў я ў арбайтсамт, там мяне лекар абследаваў і далі мне паперы дахаты.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Як немцы мелі адступаць, зноў мяне ў Прусію хацелі забраць. Выклікалі ў Вышкі, а пасля ў бельскі арбайтсамт. Там быў вахцёр са Страблі, ён прыжмурыў вока і мы праз дзірку ў прыбіральні вырваліся на волю. Хто ўцёк, той астаўся, а каго злавілі, таго вывезлі. І ўжо я хаваўся аж да прыходу саветаў, у сваёй вёсцы, але па начах у сваёй хаце не спаў.

Як саветы наступалі, то між Плютычамі і Дэніскамі разгарэліся баі. За нашай клуняй двух забітых немцаў пахавалі. Мы ім там магілку насыпалі, кветкі паклалі, крыж бярозавы паставілі. А як уварваліся саветы, то тую магілку раскідалі, растапталі. І пасля тою магілай ніхто не займаўся, так косці тых немцаў ляжаць там па сённяшні дзень.

Як гналі немцаў, то саветы панапіваліся, пабіліся і адзін другога фінкай трапіў у плечы і забіў. Труп завезлі ў Лапці і там пахавалі, а пасля таго забойцу судзілі, людзей з нашай вёскі на сведкаў бралі.

Гарэлку рускія мелі з абмену або абману. Адзін каня брату прадаваў за гарэлку: гарэлку забраў, а каня не даў, толькі прыгразіў. А наша вёска ўцалела, толькі як немцы наступалі і адступалі, то па адным нашым чалавеку загінула. Адступаючыя немцы ўзарвалі чыгуначны мост на Нарве, але саветы адразу сталі будаваць аб'язны драўляны мост, па якім неўзабаве пайшлі эшалоны, па два ў суткі, іх у Бельску разгружалі і шашою праз Браньск адпраўлялі тэхніку на фронт.

Пасля вайны сталі ў нас банды хадзіць. У Страблі чыгуначнага майстра на мост завялі і ў рэчку спусцілі невіноўнага чалавека толькі таму, што праваслаўны быў. І ў млыне аднаго забілі.

У Яцэвічы банда прыходзіла два разы. Першы раз брата ў Страблю забралі, але пусцілі. А другі раз забралі з вёскі пяць коней; ад мяне двое. А жонка з адной дзяўчынай на падворку ўцякалі; жонка бліжэй будынкаў бегла і яе не трапілі, а тая дзяўчына бегла пасярэдзіне, ранілі яе ў жывот і яна ад тых ран памерла. Адзін чалавек прывёз са станцыі ў Стаблі жонку, што з Бельска поездам прыехала. Забралі яго і пасля нейкага часу ксёндз у Вышках аб'явіў, што забіты чалавек у яме ў лесе ляжыць.

Забіралі кажухі, абутак, гадзіннікі. Цешча прасіла, каб ім хоць аднаго каня пакінулі, то адзін даў так прыкладам у грудзі, што два гады хварэла і памерла.

Пасля ў нас арганізавалі апалчэнне, мо з дзесяць чалавек пільнавала вёску, пакуль не супакоілася. А цяпер убоўцаў, што тады парадак наводзілі, праследуюць, а тых, што людзей мардавалі, не шукаюць.

Пасля сталі намаўляць нас у калгас. У Бельску сакратар партыі Казёл быў, ён да нас на сход прыехаў. А жонка кажа яму:

— Ты не хадзі па сяле з сумкаю, толькі ідзі ў калгас і рабі!

І ў Плютычах заснавалі калгас; набіралі туды тых, што з падаткамі не спраўляліся, найгоршых, старых. А я ўсё трымаўся, гаварыў жонцы:

— Хай твой пасаг бяруць у калгас, а майго не кранаюць!

Запісаў Аляксандр Вярбіцкі

Зруйнавала вайна

[III ☞ працяг]

шанцавала з каровамі, якія асталіся цэлымі.

— Старога нашага каня забілі, а каровы ўцалелі. Свінні і куры згарэлі ў хляве. Астаўся толькі адзін вяпрук, які схаваўся ў зеллі. Аднак быў ён моцна апалены і трэба было яго закалоць, — успамінае спадар Салінскі.

Калі закончыўся бой і немцы адступілі, некаторыя жыхары Чаромхі баяліся чарговых змаганняў і выйшлі з вёскі.

— Мы рашыліся ўцякаць у Дабрываду. Бачылі за вёскай пабітых рускіх салдат, — заяўляе спадарыня Внучко.

Калі ваенныя дзеянні перасунуліся на захад, жыхары Чаромхі сталі парадкаваць тое, што засталося на панадворках і думаць аб адбудове спаленых дамоў, хлявоў і гумнаў.

— Праз вуліцу ад нашага панадворка ўцалела адна хата. Спалі там і харчаваліся ўсе суседзі з навакольля. Здаралася нават, што людзі начавалі пад дрэвамі, — кажа Ян Салінскі.

Добрую пажарную машыну, якую атрымалі жыхары Чаромхі перад вайной, забралі савецкія салдаты. Яшчэ да пажару людзі выцягнулі яе на вуліцу, зберагаючы перад агнём. Пасля не здолелі яе знайсці.

— У нас каня забралі немцы, — заяўляе Яўгенія Внучко. — Знайшлі мы кульгавую кабылу і пры яе дапамозе пачалі будавацца.

— А ў нас савецкі салдат падхапіў кабылу, калі мы жыта жалі і ад'ехаў. Пакінуў нам свайго стомленага доўгай дарогай каня, — гаворыць спадарыня Люба.

Жыхары Чаромхі інфармуюць, што не атрымалі дзяржаўнай дапамогі на адбудову.

— Тады ўлада толькі пачынала арганізавацца. Адбудоўвацца дапамагалі нам сваякі. Будаўнічы матэрыял вазілі мы са сваіх лясоў. Некаторыя асобы секлі дрэвы ў дзяржаўным лесе. Аднак, каб магчы адбудоўвацца, патрэбныя былі коні, каб прывезці матэрыял з лесу. Мой бацька адкупіў двое коней, якіх мы выкарыстоўвалі ў час адбудовы, — кажа Ян Салінскі.

Вярнуліся ў спаленую вёску

— Я служыў у войску і калі вярнуўся ў Чаромху, убачыў спаленую вёску, — гаворыць Ян Кердалевіч. — Майго дома не было, у суседзяў таксама хаты згарэлі.

— Калі ў нашым сяле ішлі баі, я працавала ў Германіі. На нашым панадворку згарэла ўсё. Пасля майго вяртання дамоў бацька пачаў адбудоўвацца, — кажа Вера Кердалевіч. — Мама памерла, калі я была яшчэ маленькай дзяўчынкай і будавацца прыйшлося бацьку разам з намі — дзяцьмі. Дапамагаў нам дзядзька, а паколькі дамы будавалі тады невялікія, памалу паставілі мы хату.

— Нашае сяло знішчылі, калі я была на прымусовых работах у Германіі. Вёску ўбачыла я ўжо спаленай. Адны толькі каміны тырчэлі па-над попелам. На нашым панадворку астаўся толькі свіран, у якім жылі бацькі і астатнія сямейнікі. Усё апошняе згарэла. Кабылу забілі, але асталося жарабятка і карова, — гаворыць Люба Раманюк.

Першыя будынкі былі пастаўлены хутка, але адбудова цэлых гаспадарак замарудзілася. Жахлівыя ўспаміны асталіся па сённяшні дзень і перадаюцца дзецям і ўнукам сведкаў ваенных здарэнняў.

Аляксей Мароз